МІФЫ, БОНСЦІКІ І РОДНАЯ МОВА

ЧЫРВОНКА

НАЙЛЕПШЫ СЯБРА КЛІЕНТА ГАТЭЛЯ ЧЫРВОНКА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

31 КАСТРЫЧНІКА 2019 г. ЧАЦВЕР № 208 (29075)

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір ДВОРНІК, намеснік прэм'ер-міністра

«Экспарт — гэта важная задача, якая ставіцца дзяржавай. На сёння (за 8 месяцаў) мы маем больш за $3 млрд выручкі ад экспарту сельгаспрадукцыі. Па выніках года мы бачым, што павінны мець не менш чым $5,5 млрд. Аб'ём экспарту сёлета мы ацэньваем у 104 % да ўзроўню мінулага года. Мы вырабляем нашмат больш сельгаспрадукцыі, чым можам спажыць унутры краіны. Разам з тым надаём увагу не толькі аб'ёмам, але і фактару цэн на прадукты харчавання, каб яны былі невысокія, прымальныя для насельніцтва. Той аб'ём, які неабходны для жыццядзейнасці нашай дзяржавы (я маю на ўвазе прадукты харчавання), мы забяспечваем на 100 %. Задачы, якія ставіць кіраўнік дзяржавы, — гэта найперш цэны. Мы пастаянна адсочваем іх, маніторым у параўнанні з іншымі, з суседнімі краінамі».

КЛЮЧЫ АД ЗДАРОЎЯ

Аляксандр Лукашэнка адкрыў пансіянат у РНПЦ анкалогіі і радыялогіі і наведаў новы інтэрнат для медыкаў у вёсцы Ляскоўка

Такім чынам Прэзідэнт даў старт тыдню падарункаў народу. Гэта добрая савецкая традыцыя (адна з найлепшых, якія засталіся з тых часоў) — адкрываць напярэдадні 7 лістапада не проста важныя, а неабходныя сацыяльныя аб'екты.

Раней родныя пацыентаў Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава вымушаны былі наймаць жыллё ў прыватнікаў за непамерныя грошы, каб мець магчымасць пастаянна клапаціцца пра сваіх хворых сваякоў. А ўжо зараз для іх адкрыты пансіянат, дзе па даступных цэнах яны могуць наймаць пакоі. СТАР. 2

Фота БелТА.

СОЛЬ ЗЯМЛІ

Фота БелТА.

На чатыры месяцы раней за тэрмін завершана праходка ствалоў на Петрыкаўскім ГУКу ААТ «Беларуськалій», што ўзводзіцца. Зараз на будаўнічай пляцоўцы вядзецца ўстаноўка пастаянных копраў, заканчваецца мантаж абсталявання на абагачальнай фабрыцы. Да канца года плануецца атрымаць першую партыю прадукцыі — калійныя ўгнаенні. На здымку: намеснік галоўнага інжынера Міхаіл ІСКРЫЦКІ з узорам руды, з якой будзе атрымана першая партыя калійных угнаенняў.

СТАЖ РАБОТЫ Ў БЮДЖЭТНАЙ СФЕРЫ БУДЗЕ ВЫЛІЧАЦЦА ПА-НОВАМУ

З 1 студзеня 2020 года работнікам бюджэтнай сферы ў працоўны стаж, ад якога залежыць надбаўка за стаж, будуць залічвацца толькі перыяды работы ў бюджэтных арганізацыях. Але калі вы працавалі раней у камерцыйнай структуры, непакоіцца няма прычыны. Ваша зарплата пры гэтым не павінна зменшыцца. Пра гэта заявіў першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Андрэй ЛАБОВІЧ на анлайн-канферэнцыі, прысвечанай пытанням удасканалення сістэмы аплаты працы ў бюджэтнай сферы.

На гэты момант у стаж работы па спецыяльнасці па рашэнні наймальніка залічваюцца перыяды работы ў арганізацыях незалежна ад іх формаў уласнасці, калі характар работы, якая выконвалася, быў аналагічны рабоце, якая выконваецца ў бюджэтнай арганізацыі. Тым не менш заработная плата работнікаў з 1 студзеня наступнага года, па словах Андрэя Лабовіча, зменшыцца не можа, бо ў адпаведнасці з пунктам 12 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 18.01.2019 № 27 зніжэнне памераў налічанай заработнай платы работнікаў бюджэтных арганізацый (без прэміі), якія дзейнічалі на момант увядзення новых умоў аплаты працы, не дапускаецца.

Такім чынам, магчымае зніжэнне памераў асобных выплат (напрыклад, надбаўкі за стаж працы ў бюджэтных арганізацыях у параўнанні з павышэннем тарыфнага акладу за работу па спецыяльнасці) павінна быць кампенсавана іншымі стымулюючымі (кампенсуючымі) выплатамі, якія будуць устанаўлівацца на падставе нарматыўных прававых актаў адпаведных рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання.

Святлана БУСЬКО.

КАРАТКА

- У Беларусі адмянілі збор за анлайн-куплю білетаў на цягнік і за папярэдні продаж на аўтобус.
- **Пляцоўкі пад ёлачныя кірмашы ў Мінску будуць здавацца ў арэнду праз аўкцыён.**
- Да канца года трывожныя кнопкі з'явяцца практычна ва ўсіх установах адукацыі
- **Казахстан рыхтуе буйную гандлёвую місію ў Мінск. Вызначаны пералік з 44 таварных пазіцый на суму каля $300 млн для паставак у Беларусь.**
- Польшча можа ўзяць удзел у рэканструкцыі Старога замка ў Гродне.

ISSN 1990 - 763X

КЛЮЧЫ АД ЗДАРОЎЯ

Фота БелТА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Яшчэ адзін падарунак медыкам — новы інтэрнат маласямейнага тыпу ў вёсцы Ляскоўка. Свае кватэры там у хуткім часе атрымаюць амаль 350 сем'яў медработнікаў, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Новабудоўлямі могуць пахваліцца не толькі Бараўляны. Новыя медаб'екты на карце Мінскага раёна з'явяцца, напрыклад, у Астрашыцкім гарадку, Хацежыне, Жодзіне, у плане новыя пабудовы ў Азярцы, Заслаўі. Налета з'явіцца больш за дзясятак дзіцячых садкоў. У 2022 годзе пры ўмове пабудовы яшчэ дзвюх школ праблему забяспечанасці Мінскага раёна ўстановамі адукацыі здымуць поўнасцю.

Але, нягледзячы на святочны настрой, візіт у медцэнтр — нагода звярнуцца і да надзённых праблем усёй сістэмы.

ВЫЛЕЧЫЦЬ «ХВАРОБЫ» МЕДСІСТЭМЫ

Падчас наведвання РНПЦ Прэзідэнт заслухаў некалькі дакладаў. Першы з іх — па арганізацыі сістэмы аховы здароўя ад галіновага міністра Уладзіміра Караніка. Аляксандр Лукашэнка зацікавіўся, ці даюць маштабныя меры падтрымкі шматдзетных сем'яў плён. Па словах міністра, колькасць такіх сем'яў значна павялічваецца: «Мы стараемся захаваць кожную цяжарнасць і кожнае дзіця. У нас вырасла эфектыўнасць перадабортавага кансультавання. Застаюцца экстрэмальна нізкімі лічбы працэнту смерці немаўлят». Прэзідэнт адзначыў, што пад жорсткім кантролем павінны быць і выпадкі смерці парадзіх: «Смерць маці — гэта надзвычайная сітуацыя. І гэтага ў нашай краіне не павінна быць».

Уладзімір Каранік расказаў, як працуе канцэпцыя высокатэхналагічнай дапамогі па прынцыпе «залатой гадзіны» па ўсёй краіне: ужо даабсталяваныя цэнтры ў Полацку, Наваполацку, Маладзечне, Барысаве, Салігорску. «Вы як ацэньваеце, будзе гэта гадзіна? Ці народ будзе нас крытыкаваць, як сёння гэты цэнтр крытыкуе? — звярнуўся да суразмоўцаў кіраўнік краіны і патлумачыў: — Празрыстай чаргі тут няма, хто як вырашыць, так і будзе па аперацыях. Людзі месяцамі стаяць, каб прааперыравацца ў анкалагічным цэнтры».

Закрануў Прэзідэнт і пытанне, якое актыўна абмяркоўваюць апошнім часам у медыя, — працоўную міграцыю ўрачоў. Як патлумачыў міністр аховы здароўя, гэтая тэндэнцыя характэрна для ўсіх краін свету, але ўрачоў у нас хапае. Да 2025 года, па словах Прэзідэнта, заробкі медыкаў ужо вырастуць удвая. Але важна не толькі забяспечыць персанал медустаноў належнай зарплатай — самі ўстановы маюць патрэбу ў абсталяванні. «Галоўнае — аснасціць медыцынскім абсталяваннем і тэхнікай урачоў, каб яны мелі самае сучаснае абсталяванне, як у Германіі, Ізраілі і іншых краінах», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, папярэдзіўшы, што неабходна задзейнічаць у рабоце ўсё высокатэхналагічнае абсталяванне, якое ўжо закуплена ў медустановы.

Дырэктар РНПЦ у Бараўлянах Алег Суконка расказаў, што ў бальніцы створана сістэма вядзення хворых і новы кол-цэнтр, які дапамагае пазбягаць некалькіх стадый кансультавання. Па словах дырэктара, чаргі для хворых, якія паступаюць першы раз, няма.

Свае меркаванні па ўдасканальванні сістэмы анкалячэння выказаў і памочнік Прэзідэнта Аляксандр Косінец: «Трэба правадзіць дэцэнтралізацыю, якую пачалі ў 2007 годзе. Не трэба манаполіі, неабходна больш развіваць абласныя анкалагічныя дыспансеры, даваць ім самастойнасць». Яму і даручыў Аляксандр Лукашэнка кантраляваць гэты працэс.

АБ'ЕКТ СПРАВЯДЛІВАСЦІ

Пансіянат на тэрыторыі РНПЦ будавалі спецыяльна для сваякоў хворых. «Гэта маё было даручэнне, першае пасля звароту Алега Суконкі, калі я наведаў гэты цэнтр. Людзі цяжкахворыя пачалі казаць, што тут іх даглядаюць родныя, дзеці, блізкія. Яны дзень, вечар з імі пасядзелі, дагледзелі. А ім жа трэба дзесьці пераначаваць. Гэта ж не толькі мінчане. Ім начаваць ёсць дзе, але гэта каштуе вялікіх грошай, — расказаў Прэзідэнт. — Я даручыў пабудаваць за кошт дзяржавы такую гасцініцу, дзе родныя, якія дапамагаюць клапаціцца пра цяжкахворых, маглі б пераначаваць».

Жыць у пансіянаце таксама могуць амбулаторныя пацыенты, слухачы курсаў, але прыярытэт — людзям, якія даглядаюць хворых родных. «Калі ў вас будуць месцы, вы хоць Алега Суконку пасяліце тут за грошы, — адзначыў Прэзідэнт. — Вы павінны зарабляць грошы на астатняй плошчы, але запомніце: дзерці скуру з людзей, якія трапілі ў бяду, ні ў якім разе нельга».

Цэнтр ужо поўнасцю пабудаваны, абсталяваны, адчыніць свае дзверы ўстанова 4 лістапада. У родных цяжкахворых хапае праблем і перажыванняў. «Таму трэба, каб людзі разумелі, што ёсць справядлівасць. І вось гэта — аб'ект справядлівасці», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандру Лукашэнку паказалі некаторыя пакоі пансіяната на першым паверсе, сталоўку. У нейкі момант усё пайшло не па плане экскурсаводаў — Прэзідэнт адхіліўся ад маршруту, вырашыўшы зайсці ў харчовы блок. Там паразмаўляў з рабочымі кухні, кухарамі, дыетолагамі.

Недалёка ад цэнтра, у вёсцы Ляскоўка, размясціўся інтэрнат маласямейнага тыпу — наступны пункт маршруту кіраўніка дзяржавы. У кожным з трох дзесяціпавярховых будынкаў па 116 кватэр — адна- і двухпакаёвых. А на першым паверсе не толькі адміністрацыйныя і вучэбныя памяшканні, але і пакоі адпачынку, дзіцячы пакой. Пляцоўка для гульняў малых прадугледжана і на вуліцы. Новы будынак Прэзідэнт ацаніў нават не як інтэрнат, а як паўнавартасны жылы дом.

ТРЫ «КІТЫ» ДЛЯ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

Падчас наведвання РНПЦ Аляксандр Лукашэнка пагутарыў з журналістамі беларускіх СМІ. Рэпарцёры згадалі, што сацыяльнай сферы і, у прыватнасці, ахове здароўя ў нашай краіне заўсёды ўдзялялася шмат увагі.

Аднак апошнім часам на беларускіх медыкаў усё больш уважліва глядзяць і з-за мяжы, актыўна запрашаючы на работу. Прычым некаторыя краіны нават змяняюць заканадаўства. Напрыклад, у Польшчы плануецца ўвесці новыя правілы прыёму на работу ўрачоў з-за межаў Еўрасаюза — ім не трэба будзе пацвярджаць дыплом, толькі прайсці іспыт у клініцы.

Прэзідэнт адзначыў, што рэагаваць на гэту сітуацыю краіна, безумоўна, будзе. Але Аляксандр Лукашэнка не стаў хаваць абурэння, што нам усе ставяць у прыклад Польшчу. Пры гэтым, задаў ён рытарычнае пытанне, калі так паспяхова развіваецца іх краіна, дык чаго тады паклалі вока на спецыялістаў з «гэтай дыктатуры — Беларусі»? І першая рэакцыя ўлады ў такой сітуацыі — не словы, а справы, якімі становіцца будаўніцтва падобных інтэрнатаў і ўвогуле стварэнне ўмоў для медыкаў. Уласнае жыллё будзе моцна «прывязваць» чалавека да клінікі і роднай зямлі ўвогуле. Яшчэ адзін кірунак у захаванні спецыялістаў — заработная плата.

«Тут (у РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі. — **«Зв.»**) людзі маюць розную зарплату. Супервысокай кваліфікацыі — некалькі тысяч долараў. Не буду называць, гэта справа іх. Нават кажа Суконка: часам у ведамасць глядзіш — пры нашай сярэдняй зарплаце нават непрыстойна. Гэта самыя высокія зарплаты ва ўрача. Але гэта высакакласныя спецыялісты. Так і павінна быць: калі ты займаешся навукай, карыснай навукай для практыкі, калі ты высокатэхналагічны хірург і гэтак далей — ты мусіш атрымліваць нямала», — абазначыў пазіцыі Аляксандр Лукашэнка, падкрэсліўшы, што калі чалавек жадае зарабіць больш, у яго павінна быць такая магчымасць.

І трэцяе, на чым грунтуецца адданасць медыкаў, — адукацыя. Прэзідэнт адзначыў, што яе ўзровень нельга зніжаць ні ў якім выпадку. Больш таго, ён праанансаваў свой візіт у медуніверсітэт, каб на спецыяльнай нарадзе ўзняць праблемныя пытанні ў медыцынскай адукацыі.

«Гэта таксама вельмі важна: каб утрымліваць урача, яму трэба яшчэ і адукацыю добрую даць, не толькі ўмовы жыцця і заработную плату. Ну і нешта потым мы абсалютна на міжнародных прынцыпах зробім, каб людзі тут працавалі. Нас гэта хвалюе, але не напружвае», — падвёў вынік Аляксандр Лукашэнка.

Ён упэўнены: у тым, што чалавек паехаў за мяжу і павысіў сваю кваліфікацыю, няма нічога страшнага. Галоўнае, каб ён не забываў пра краіну, вяртаўся і дапамагаў на сваёй зямлі. А сілком утрымліваць ні ўрачоў, ні настаўнікаў, ні інжынераў ніхто не будзе. Па-першае, гэта і не атрымаецца, а па-другое, свет глабалізуецца, людзі перамяшчаюцца. Таму працаваць у гэтым плане можна толькі цывілізавана, падкрэсліў беларускі лідар.

«ВОКНЫ» І «ШЛЯХІ» ПА ЎСІХ НАПРАМКАХ

Наступнае пытанне журналістаў было аб знешняй палітыцы і экспарце. Графік кіраўніка краіны апошнім часам вельмі насычаны — кожны тыдзень замежныя візіты, калісьці і па два на тыдні. Напярэдадні Аляксандр Лукашэнка анансаваў візіт на Блізкі Усход. Яшчэ на пачатку месяца пасол Аўстрыі расказала, што і ў яе краіне ў лістападзе чакаюць беларускага лідара. Што ў палітыцы ўзаемаразуменне наладжваецца — відавочна. А што ў эканоміцы? Якіх вынікаў чакае Прэзідэнт ад маючых адбыцца візітаў і перагавораў?

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, справа кіраўніка дзяржавы — з часоў Пятра I — «прасекчы» акно туды, куды ён лічыць патрэбным і мэтазгодным для яго краіны. «Калі Прэзідэнт прыехаў у Кітай, у Індыю, на Блізкі Усход, у Расію, зараз у Аўстрыю, потым у Латвію, гэта значыць, Прэзідэнт мусіць не толькі шлях пракласці туды, а следам павінны прыйсці тыя, хто будзе прадаваць сваю прадукцыю, купляць там і гэтак далей. Вось мая задача», — растлумачыў Прэзідэнт. Але, адзначыў ён, у Беларусі склалася так, што недастаткова прасекчы акно і пракласці шлях, каб начальнікі пачалі імкнуцца да новых гарызонтаў. Таму Прэзідэнт мае ехаць зноў, дамаўляцца і «гандляваць за іншых».

Аляксандр Лукашэнка назваў будучыя візіты ў Аўстрыю і Латвію «акном» у агароджы, якую вакол нас узвялі ўведзенымі санкцыямі. Таму дзяржава мусіць на новым узроўні ствараць новыя сувязі.

На Блізкім Усходзе Аляксандр Лукашэнка бываў неаднаразова. Асаблівасць работы з арабскім светам — багатыя краіны Заліва хочуць працаваць не па дзяржаўнай лініі, а з сям'ёй. «Я ім тлумачу, што ў нас гэта не прынята, — не, размаўляць не жадаюць. Таму ў мяне старэйшы сын у ролі памочніка, ён пастаянна курыруе гэтыя сферы. І яны на гэта ідуць. Мы выбудавалі, асабліва з Эміратамі, добрыя адносіны. Шэйх быў тут, мы сустракаліся, пра многае дамовіліся. І мне вельмі спадабалася яго ідэя — кажа: калі я прафінансую вашых фермераў, сялян і куплю ў вас прадукцыю? Ён упэўніўся, што гэта вельмі якасная прадукцыя. Кажу: для нас гэта падарунак», — расказаў Прэзідэнт. Ён пераканаў: калі краіны гатовы інвеставаць у Беларусь, пашыраць сваю прысутнасць, гэта трэба замацоўваць.

ХТО МЫ, КОЛЬКІ НАС, ЯКІЯ МЫ?

У Беларусі завяршаецца перапіс насельніцтва. Нечакана гэтая кампанія выклікала дастаткова балючую рэакцыю асобных людзей і рэсурсаў, чаго не назіралася раней. Нават гучалі заклікі да байкоту. Журналісты запыталі, як, на погляд Прэзідэнта, можна растлумачыць настолькі неадэкватную рэакцыю на традыцыйную і важную кампанію.

«Вытокі неадэкватнасці — у розумах неадэкватных людзей. Часта кажам: ім што ні зрабі — усё блага. Вось ёсць у нас некалькі тысяч такіх людзей: перапіс — гэта дрэнна, асабістыя звесткі кудысьці трапяць — дрэнна», — пракаментаваў Аляксандр Лукашэнка.

«Які там страх? Пры перапісе ў кішэню не лезуць, капейкі ці рублі не лічаць. Надуманасць нейкая — «не будзе карысці ад гэтага». Ці — «непразрысты перапіс». Слухайце, з аднаго боку кажуць, каб звесткі кудысьці не трапілі, а тут кажуць — гэта непразрыста і параўноўваюць з выбарамі», — Прэзідэнт лічыць, што не варта і ўвагі звяртаць на падобныя «выпады».

Дзяржаве трэба ведаць колькасць насельніцтва, яго структуру, узровень жыцця, каб далей працаваць. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што хутка пачнецца планаванне новай пяцігодкі, а напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў трэба дакладна скласці спісы выбаршчыкаў.

ГАЛОЎНЫ ПАДАРУНАК

Беларусь — адна з нямногіх краін былога СССР, якія захавалі агульнадзяржаўны статус дня Кастрычніцкай рэвалюцыі. Па перакананні Прэзідэнта, база для развіцця Беларусі створана менавіта ў СССР, краіна была высокатэхналагічная. Мы не адмаўляемся ад мінулага — таму і вырашана было захаваць свята. У незалежнай краіне ён прапанаваў працягнуць традыцыю падарункаў людзям: заканчваць сацыяльныя аб'екты, будоўлі, сельскагаспадарчыя работы. Падводзіць вынікі, карацей кажучы.

Што да адпачынку на свята, у Аляксандра Лукашэнкі няма магчымасці сысці ў водпуск, бо ў Прэзідэнта няма намеснікаў. Нават у тыя тры дні на наступным тыдні, якія кіраўнік дзяржавы будзе паза межамі краіны, у краіне будуць рыхтавацца нарады па ходзе прыярытэтных інвестыцыйных будаўніцтваў, якія каштуюць мільярды долараў; па падвядзенні вынікаў выбараў у Савет Рэспублікі і падрыхтоўцы да выбараў у Палату прадстаўнікоў; па кадравых і іншых пытаннях.

Запыталіся карэспандэнты пра тое, што Прэзідэнт асабіста хацеў бы атрымаць у падарунак да свята.

«Еду з Суконкам і думаю: каб яны навучыліся вылечваць людзей ад гэтай страшнай хваробы, які быў бы падарунак не толькі мне, але і ўсім нам. Хоць яны і эфектыўна працуюць, як ён кажа, — 70—75 працэнтаў у іх людзі жывуць. Праўда, і людзі самі вінаватыя, нясвоечасова звяртаюцца да ўрачоў. Але вось нам бы перамагчы хваробу — чалавецтва б уздыхнула глыбей і на поўныя грудзі. Вось гэта быў бы падарунак», — марыць кіраўнік дзяржавы.

Марыя ДАДАЛКА, Варвара МАРОЗАВА.

Будзь у курсе!

Абвешчаны графік работы пунктаў спрошчанага пропуску

Дзяржпагранкамітэт Беларусі апублікаваў графік работы пунктаў спрошчанага пропуску на беларуска-літоўскай граніцы ў Дзень усіх святых і Дзень памінання памерлых. Такая інфармацыя размешчана на сайце ведамства.

На граніцы з Літвой 1-2 лістапада будуць працаваць пункты спрошчанага пропуску «Відзы» (Браслаўскі раён) — кругласутачна, «Доцішкі» (Воранаўскі раён) — з 10.00 да 19.00, «Парэчча» (Гродзенскі раён) — з 9.00 да 19.00, «Пяцюлеўцы» (Шчучынскі раён) — з 12.00 да 17.00.

Пункт спрошчанага пропуску «Кемелішкі» ў Астравецкім раёне будзе адкрыты 1 і 2 лістапада з 10.00 да 17.00. Перайсці граніцу праз пункт пропуску «Пяцкуны» ў Іўеўскім раёне 1 і 2 лістапада можна будзе з 12.00 да 17.00, а праз «Геранёны» ў тыя ж дні з 11.00 да 17.00.

Граніцу з Латвіяй у гэтыя ж дні з 9.00 да 17.00 можна будзе перасекчы праз пагранічны пераход «Плюсы» (Браслаўскі раён), а таксама праз «Гаўрыліна» (Верхнядзвінскі раён) — пры наяўнасці заявак.

У гэтых пунктах спрошчанага пропуску могуць перасякаць граніцу грамадзяне, якія стала жывуць на пагранічнай тэрыторыі.

Дадатковую інфармацыю можна атрымаць па тэлефоне гарачай лініі Дзяржпагранкамітэта (017) 216 26 12.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Усё пра аўтасэрвіс, дарогі і відэафіксацыю

У Мінску пад дахам Футбольнага манежа адкрыліся адразу дзве міжнародныя спецыялізаваныя выстаўкі «Аўтасэрвіс. Механіка. Аўтакампаненты» і «Дарожнае будаўніцтва».

Сярод іх удзельнікаў прадстаўнікі Расіі, Украіны, Германіі і іншых краін. Яны на сваіх стэндах паказалі станцыі тэхнічнага абслугоўвання, шынамантаж, абсталяванне для мыцця транспартных сродкаў, іх дыягностыкі і рамонту. Прадстаўлены тут і аўташколы і школы экстрэмальнага кіравання, спецыяльная літаратура, аўтацюнінг, аксэсуары, сродкі аховы любімага «жалезнага каня», аўтакасметыка, аўтахімія, мабільная сувязь, аўтамабільная электроніка, аўдыё- і відэатэхніка.

А якія разнастайныя сістэмы сёлета можна тут убачыць! Напрыклад, сістэмы экстраннай сувязі на дарогах са службамі аператыўнага рэагавання, кантролю надвор'я на дарогах, перадачы інфармацыі і сувязі, фота-, відэафіксацыі і кантролю дарожнай сітуацыі, кантролю і фіксацыі выканання правілаў дарожнага руху і г. д.

Для кіроўцаў карысна ўбачыць на свае вочы навінкі інфармацыйнага забеспячэння ўдзельнікаў дарожнага руху, скажам, сістэмы інфармавання пра размяшчэнне парковак і наяўнасць свабодных месцаў, новыя рашэнні і прапановы па арганізацыі паўнавартаснага прыдарожнага сэрвісу. Яго перавагі пачынаеш цаніць толькі за рулём у час доўгага падарожжа.

У дзелавой праграме выставак звяртае на сябе ўвагу канферэнцыя «Інавацыйныя тэхналогіі і абсталяванне для дарожнай галіны». Тут размова пойдзе пра вытворчасць новых дарожна-будаўнічых матэрыялаў, выкарыстанне тэхнагенных адходаў для будаўніцтва мясцовых дарог, у цэлым пра павышэнне эфектыўнасці эксплуатацыі ўнутрыгаспадарчых дарог невялікай працягласці.

Запланавана міжнароднае спецыялізаванае спаборніцтва сярод экспертаў у сферы транспартных тэхналогій SERVICE MASTER 2019.

Леанід ТУГАРЫН.

ВЕСТКА З МІНУЛАГА

Пячатку Уладзіміра Манамаха знайшлі падчас раскопак на тэрыторыі Новага замка ў Гродне

Як паведамілі карэспандэнту БелТА ў Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі, так званую вялую пячатку, якую можна аднесці да першых гадоў існавання Гродна, падчас работ на Новым замку знайшоў археолаг Іван Спірын.

«Такія свінцовыя пячаткі зацісканліся на шнурках, прымацаваных да дакументаў, напрыклад, лістоў. З пячаткай яшчэ будуць працаваць спецыялісты, але ўжо можна выказаць здагадку, што яна належала князю Уладзіміру Манамаху, бацьку гродзенскай князёўны Агаф'і», — расказалі ў музеі. На адным баку пячаткі змешчана выява Васілія Кесарыйскага (нябесны заступнік Манамаха), а з другога боку размешчаны надпіс на старажытнарускай мове з просьбай аб божай дапамозе.

Такія пячаткі адносяцца да позняга перыяду ўлады Уладзіміра Манамаха (пасля 1113 года). У музеі адзначылі, што ў 1116 годзе вялікі князь кіеўскі Уладзімір Манамах выдаў сваю дачку Агаф'ю за князя Усевалада Давыдавіча, якога ў 1127 годзе ў першай летапіснай згадцы пра Гродна называюць гродзенскім князем.

Гэта не першая незвычайная знаходка на тэрыторыі гродзенскіх замкаў. Пры рэканструкцыі Старога замка,

у прыватнасці, было арганізавана археалагічнае суправаджэнне. Усяго за два гады раскопак на яго тэрыторыі знойдзена больш за 3 тысячы артэфактаў. Сярод іх не толькі прадметы побыту (цвікі, наканечнікі стрэл, гузікі), але і каштоўныя ўпрыгажэнні, сярэднявечныя шахматныя фігуры, фрагмент гульнявой дошкі.

ПЕРШЫ Ў АЛІМПІЙСКІМ СЕЗОНЕ

На «Мінск-Арэне» стартаваў этап Кубка свету па веласіпедным спорце на трэку

Удзел у спаборніцтвах бяруць 386 гоншчыкаў з 44 краін. Яны будуць змагацца не толькі за ўзнагароды турніру, але і за рэйтынгавыя ачкі для адбору на летнія Алімпійскія гульні 2020 года. У праграму спаборніцтваў увайшлі такія дысцыпліны, як індывідуальны і камандны спрынт, камандная і індывідуальная гонка праследавання, кейрын, омніум, мэдысан і гонка па ачках.

Беларуская каманда на дамашнім турніры выступіць наймацнейшым складам, у яе ўвайшлі 17 спартсменаў, у тым ліку ўсе лідары — Таццяна Шаракова, Яўген Каралёк, Міхаіл Шэметаў, Раман Цішкоў, Раман Раманаў і іншыя. «Я не першы раз буду выступаць на такім буйным турніры ў Мінску, дамашнія сцены дапамагаюць злавіць кураж і дадаюць сіл. Цяпер я чакаю сур'ёзнай барацьбы, таму што на гэты этап Кубка свету прыехалі ўсе наймацнейшыя гоншчыкі — па ўзроўні ён будзе амаль як чэмпіянат свету», — падкрэсліў **чэмпіён свету, уладальнік Кубка свету Яўген КАРАЛЁК.**

«Мы маем намер парадаваць гасцей найвышэйшым узроўнем правядзення спаборніцтваў, а спартсмены — высокімі вынікамі. Хочацца пажадаць усім узрушальных эмоцый ад выступлення нашай зборнай. Вельмі ганарымся тым, што нам даверылі правесці першы ў алімпійскім сезоне этап Кубка свету. Гэта двайная адказнасць, але мы справімся», — заявіла **старшыня Беларускай федэрацыі веласіпеднага спорту Наталля ЦЫЛІНСКАЯ.**

Дырэктар этапу Кубка свету, генеральны менеджар веласіпеднага клуба «Мінск» Аляксей ІВАНОЎ адзначыў, што арганізатары чакаюць высокага інтарэсу з боку балельшчыкаў, якія змогуць не толькі атрымаць задавальненне ад спаборніцтваў, але таксама паўдзельнічаць у конкурсах і віктарынах. Асобная забаўляльная праграма падрыхтавана для дзяцей.

«Дзякуем Міжнароднаму саюзу веласіпедыстаў за аказаны давер. Прыём спаборніцтваў такога ўзроўню быў бы немагчымы без падтрымкі з боку беларускай дзяржавы, якая ўдзяляе значную ўвагу развіццю спорту і здаровому ладу жыцця», — сказаў Аляксей Іваноў.

Першы этап Кубка свету будзе працягвацца да 3 лістапада.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Брытанію чакаюць датэрміновыя выбары

Датэрміновыя парламенцкія выбары пройдуць у Вялікабрытаніі 12 снежня, перадае ВВС.

Такое рашэнне было прынята большасцю галасоў у палаце абшчын — 428 супраць 20-ці. Зараз гэтае рашэнне павінна адобрыць палата лордаў.

Прэм'ер-міністр Борыс Джонсан разлічвае, што на пазачарговых выбарах яго кансерватыўная партыя заваюе большасць месцаў у палаце абшчын, і ён зможа ўрэгуляваць складаную сітуацыю з выхадам Вялікабрытаніі з Еўрасаюза, каб краіна пакінула ЕС 31 студзеня 2020 года.

Ці будзе крызіс пераадолены і ці ўдасца яму перамагчы, прадказаць ніхто не бярэцца. Зараз рэйтынг кансерватыўнай партыі дастаткова высокі, аднак перадвыбарчая кампанія можа змяніць расклад сіл. Акрамя таго, спецыфіка брытанскай выбарчай сістэмы не гарантуе, што папулярная партыя зможа атрымаць большасць месцаў у парламенце.

Дыппрадстаўніцтвы Ізраіля ва ўсім свеце прыпынілі работу

Усе пасольствы і консульствы Ізраіля прыпынілі сваю дзейнасць у сувязі з забастоўкай, выкліканай канфліктам міністэрства замежных спраў з міністэрствам фінансаў краіны. Адпаведная заява была размешчана ў сераду на афіцыйным сайце знешнепалітычнага ведамства Ізраіля.

«У сувязі з рашэннем міністэрства фінансаў парушыць узгодненыя і падпісаныя генеральным дырэктарам мінфіна 21 ліпеня 2019 года дамоўленасці і абавязаць па-

сланнікаў дзяржавы Ізраіль, якія служаць за мяжой, у аднабаковым парадку выконваць новыя ўказанні, што супярэчаць раней дасягнутым умовам і парушаюць парадак, які існуе ўжо некалькі дзесяцігоддзяў, мы вымушаны закрыць дыпламатычныя прадстаўніцтвы», — гаворыцца ў паведамленні. На працягу забастоўкі доступ наведвальнікаў у прадстаўніцтвы Ізраіля за мяжой будзе прыпынены, паслугі аказвацца не будуць.

У МЗС краіны заявілі, што рашэнне змяніць парадак работы дыппрадстаўніцтваў і працэдуру іх фінансавання наносіць шкоду асноватворным інструментам функцыянавання ведамства і краіны ў цэлым. У ведамстве адзначылі, што мінфін не пакінуў дыпламатам іншага выбару і выказалі надзею на ўрэгуляванне канфлікту ў найбліжэйшы час.

В.а. прэм'ера Іспаніі паабяцаў, што Каталонія ніколі не будзе незалежнай

Каталонія ніколі не выйдзе са складу Іспаніі, заявіў у сераду выконваючы абавязкі старшыні ўрада краіны Педра Санчэс у інтэрв'ю тэлеканалу Antena 3.

«Праблема ў Каталоніі заключаецца не ў незалежнасці, якой ніколі не здарыцца, — сказаў в.а. прэм'ера. — У Каталоніі ёсць праблема суіснавання». «Мы з'яўляемся сведкамі правалу руху за незалежнасць з палітычнага пункту гледжання», — дадаў Санчэс. Ён таксама запэўніў, што гатовы весці дыялог з рэгіянальнымі ўладамі «ў рамках дэмакратычнай законнасці».

ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

Продавец: Частное строительное унитарное предприятие «ГостСтрой» (УНП 590778694), 223034, Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Советская, д. 118, комн. 1/4, в лице антикризисного управляющего ООО «Юридический момент», тел. +375 (29) 616-50-57.

Повторные публичные торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) (далее – торги) будут проведены: **15 ноября 2019 г.** 09.00–17.00 на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена, бел. руб. без НДС
1	Капитальное строение, инв. № 124/С-21348, здание административно-хозяйственное – административное здание, площадь 450,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Пружанский р-н, г. п. Пружаны, ул. Лазо, 22	44 455,46
2	Капитальное строение, инв. № 124/С-21346, здание пристройки к заводоуправлению, площадь 298,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Пружанский р-н, г. п. Пружаны, ул. Лазо, 22	29 422,84

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698 53 53.

Для участия в торгах необходимо в срок по 14.11.2019 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY;** 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. После этого между продавцом и победителем торгов в течение десяти рабочих дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовало в газете «Звязда» от 20.09.2019 г.

www.girza.by

Рассекатели веток «СЕКАЧ» и щепорезы «ДРОБНЯК» для переработки древесных отходов в дешевое топливо под пиролизные и твердотопливные котлы, камины, печи. Производим и поставляем продукцию согласно запросу каждого клиента.

Работаем по всей территории РБ.

УНП 691586696

Тел. 8(029) 675 18 75

ПРАГРАМЫ КАНДЫДАТАЎ У ДЭПУТАТЫ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ СЁМАГА СКЛІКАННЯ

КАСТУСЁЎ РЫГОР АНДРЭЕВІЧ

Перадвыбарчая праграма кандыдата ад партыі БНФ

Мая Радзіма — Беларусь!

Я, кандыдат ад партыі БНФ, лічу прыярытэтам абарону беларускіх нацыянальных інтарэсаў: умацаванне палітычнай, ваеннай, эканамічнай, энергетычнай ды інфармацыйнай незалежнасці Беларусі, адраджэнне нашай мовы, аднаўленне дэмакратыі і прававой дзяржавы, пераход да новай эканамічнай мадэлі для свабоды і дабрабыту беларусаў.

Палітыка цяперашняга ўрада і чыноўнікаў, бяздумна падтрыманая дэпутатамі паслухмянага парламента, завяла краіну ў палітычны і эканамічны тупік.

БНФ мае праграму ўсебаковых рэформаў па прынцыпе «Не народ для ўрада, а ўрад для народа!», каб беларусы жылі годна і заможна ды былі сапраўднымі гаспадарамі на сваёй зямлі, каб нашы людзі не былі вымушаныя шукаць работы і лепшай долі ў замежжы.

Ніякіх новых зборaў і падаткаў! У новым складзе парламента не месца тым, хто раней уводзіў новыя падаткі і зборы, у тым ліку ганебны збор з непрацуючых.

Разумная прыватызацыя: ва ўласнасці дзяржавы застануцца толькі тыя прадпрыемствы, што маюць стратэгічнае значэнне.

Бар'еры для рэалізацыі беларусамі права ўласнасці на зямлю павінны быць знятыя, а правы ўласнікаў нерухомасці — надзейна абароненыя.

Дадзім свабоду ды падтрымку бізнесу, вызвалім яго ад адміністрацыйнага ціску, зменшым падаткі.

Дыверсіфікуем пастаўкі энерганосьбітаў для забеспячэння энергетычнай незалежнасці Беларусі.

Створым эканамічныя стымулы і ўмовы для вяртання беларусаў, якія працуюць за мяжой.

Прымем закон пра «Карту суайчынніка» для ўмацавання культурных, гаспадарчых і адукацыйных сувязяў з беларусамі замежжа.

Падтрымка сям'і дапаможа скараціць колькасць разводаў і абортаў, што нішчаць будучыню нацыі.

Спыненне алкагалізацыі насельніцтва — дзяржаўная задача.

Абарона навакольнага асяроддзя: развіццё ўзнаўляльных і альтэрнатыўных крыніц энергіі, інфраструктуры для электрамабіляў, энергаэфектыўная вытворчасць, закон пра абарону жывёл.

Бюджэт аховы здароўя трэба павялічыць да еўрапейскіх стандартаў, таксама развіваючы медычнае страхаванне. Людзям павінны быць даступныя як айчынныя, так і замежныя лекі.

Замест павышэння пенсійнага ўзросту — пераход да накапляльнай сістэмы, каб пенсійныя адлічэнні назапашваліся і выплачваліся пасля выхаду на пенсію, а сваякі пенсіянераў у выпадку іх смерці мелі права атрымаць у спадчыну недавыплачаную частку пенсіі.

Падтрымка роднай мовы, адукацыі і культуры: спыніць скарачэнне беларускамоўных школ, стварыць сістэму вышэйшай адукацыі на беларускай мове.

Размеркаванне студэнтаў — выключна на добраахвотнай аснове. Адтэрміноўкі ад вайсковай службы павінны даваць магчымасць моладзі атрымаць адукацыю.

БНФ выступае за адмену татальнай кантрактнай сістэмы.

Мы за вяртанне спрадвечных беларускіх сімвалаў: герба «Пагоня» і Бела-Чырвона-Белага сцяга.

Дэмакратыя, прававая дзяржава, падзел галін улады: законы павінны быць вышэйшыя за ўказы і дэкрэты, а суды — незалежныя ад выканаўчай улады і падпарадкаваныя толькі закону.

Цэнзура недапушчальная: свабода слова павінна быць гарантаваная для ўсіх СМІ і для інтэрнэту, людзі не павінны сядзець у турме за свае думкі, словы і перакананні.

Кіраўнікі выканкамаў павінны абірацца грамадзянамі на свабодных выбарах.

Барацьба з карупцыяй — прыярытэт: хто не краў — сядзець не будзе, а хто скраў — павінны быць пакараны.

Выйдзем з Еўразійскага саюза, які ёсць крыніцай праблем у эканоміцы, скасуем дамову пра «Саюзную дзяржаву», якая пагражае суверэнітэту Беларусі.

Створым бязвізавы рэжым з дзяржавамі Еўрасаюза.

Надзейная мяжа з Расіяй спыніць паток злачыннасці, нелегальнай міграцыі ды наркотыкаў.

Беларусь мусіць выйсці з Арганізацыі дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ), якая пагражае ўцягваннем нас ва ўзброеныя канфлікты ў Азіі. Замежныя вайсковыя аб'екты павінны быць выдаленыя з тэрыторыі краіны.

Далучым Беларусь да Сусветнай гандлёвай арганізацыі (WTO), каб адкрыць прадпрыемствам доступ на сусветны рынак, а беларусам даць доступ да якасных і танных тавараў.

З платформай партыі БНФ можна азнаёміцца на сайце www.narodny.org

АСТРОЎСКІ ВАСІЛЬ УЛАДЗІМІРАВІЧ

Я, Астроўскі Васіль Уладзіміравіч, кандыдат ад партыі БНФ па 102 Заходняй акрузе, намеснік старшыні Беларускага таварыства абароны спажыўцоў, старшыня Мінскай абласной арганізацыі абароны спажыўцоў, бяру ўдзел у выбарчай кампаніі дзеля рэалізацыі праграмы нашай партыі, з якой вы можаце азнаёміцца на партыйнай старонцы **http://narodny.org/** Разам з тым, сваімі ўласнымі прыярытэтамі я лічу: удасканаленне механізма абароны правоў спажыўцоў, падтрымку малога і сярэдняга бізнесу, барацьбу з усеўладдзем чыноўніцтва, адстойванне першынства інтарэсаў чалавека перад інтарэсамі дзяржавы.

Я выступаю за рэальную свабоду бізнесу, за перагляд заканадаўства, каб вызваліць прадпрымальнікаў ад ціску дзяржавы. Для аздараўлення эканомікі крытычна неабходна зніжэнне падаткаў і даступнасць крэдытавання.

На працягу найбліжэйшых 3—5 гадоў падатковы цяжар мусіць быць паступова зніжаны. Агульная сума ўсіх падаткаў не павінна перавышаць 10 % усіх даходаў.

Я за даступныя крэдыты для грамадзян і для бізнесу. Крэдытная стаўка не павінна быць большай за 5 % гадавых.

Прадукты харчавання і тавары, зробленыя ў Беларусі, мусяць прадавацца па цэнах на 10—15 % ніжэйшых, чым у суседзяў. Цэны на якасныя лекі, у тым ліку імпартныя, не павінны быць завышаныя. Для пенсіянераў 20—30 % ад кошту лекаў павінна кампенсавацца дзяржавай.

Я і партыя БНФ за разумную прыватызацыю: у дзяржаўнай уласнасці застануцца толькі тыя прадпрыемствы, якія маюць стратэгічнае значэнне.

Мы вернем рэальную і абароненую законам прыватную ўласнасць на зямлю для грамадзян Беларусі. Прыватная ўласнасць мусіць быць асновай дзяржавы.

Я за тое, каб быў здзейснены акт гістарычнай справядлівасці: зямля і будынкі павінны быць вернутыя нашчадкам тых, хто імі валодаў да 1917 года, а ў Заходняй Беларусі — да 1939 года.

Замест павышэння пенсійнага ўзросту — павышэнне пенсій, пераход да накапляльнай сістэмы, каб пенсійныя адлічэнні накопліваліся і выплачваліся пасля выхаду на пенсію. Родныя пенсіянераў, у выпадку іх смерці, павінны атрымаць у спадчыну недаатрыманыя пенсійныя адлічэнні.

Я за аднаўленне дэмакратыі ў краіне і за прававую дзяржаву на аснове прынцыпу падзелу галін улады. Законы мусяць быць вышэй за ўказы і дэкрэты. Свабода слова павінна быць гарантаваная. Грамадзяне Беларусі павінны наўпрост абіраць кіраўнікоў мясцовых органаў улады на сяле, у раёнах, абласцях і гарадах.

Колькасць дзяржаўных чыноўнікаў трэба знізіць на 75 %. Пры гэтым ніводзін з іх не павінен прыходзіць на дзяржаўную службу адразу са студэнцкай лавы — папярэдне ён будзе абавязаны адпрацаваць не менш за 3 гады ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы ці сферы паслуг. Каб пазбегнуць адарванасці чыноўнікаў ад патрэб і інтарэсаў звычайных грамадзян, тэрмін бесперапыннага знаходжання ў дзяржапараце мае быць абмежаваны 10 гадамі.

Барацьба з карупцыяй — першачарговы прыярытэт. Мы правядзём праверку ўсіх асоб, якія знаходзіліся на дзяржаўнай службе з 1995 года і валодаюць жыллёвай маёмасцю, рынкавы кошт якой перавышае 500 тыс. рублёў, на прадмет легальнасці сродкаў, укладзеных у гэтае жытло. Будзе ўведзеная абавязковая штогадовая публікацыя звестак пра даходы і маёмасць усіх дзяржаўных чыноўнікаў — ад кіраўніка сельвыканкама да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Я зраблю ўсё, каб спыніць засілле на беларускім рынку кантрафактнай прадукцыі кітайскай і расійскай вытворчасці, небяспечнай для жыцця і здароўя нашых грамадзян-спажыўцоў. Ні адзін тавар, які прадаецца ў Беларусі, не павінен трапляць у гандлёвыя сеткі без яго праверкі незалежнай экспертызай і ўзгадненне з Беларускім таварыствам абароны спажыўцоў.

У сферы знешняй палітыкі я за незалежную нейтральную Беларусь, якая не ўдзельнічае ні ў якіх ваенных і палітычных блоках, за бязвізавы рэжым з дзяржавамі Еўропы і Паўночнай Амерыкі.

Я, Васіль Астроўскі, іду на выбары з мірам і дабром.

Будзем адзіным фронтам змагацца, каб шчаслівыя і багатыя былі кожная сям'я, кожны грамадзянін краіны.

Мы зробім па-іншаму!

Мы зробім усё лепш для людзей!

З намі Бог! Жыве Беларусь!

НАГЛІН МІКІТА ВІКТАРАВІЧ

Перадвыбарчая праграма кандыдата ад партыі БНФ

Мая Радзіма — Беларусь!

Я, кандыдат ад партыі БНФ, лічу прыярытэтам абарону беларускіх нацыянальных інтарэсаў: умацаванне палітычнай, ваеннай, эканамічнай, энергетычнай ды інфармацыйнай незалежнасці Беларусі, адраджэнне нашай мовы, аднаўленне дэмакратыі і прававой дзяржавы, пераход да новай эканамічнай мадэлі для свабоды і дабрабыту беларусаў.

Палітыка цяперашняга ўрада і чыноўнікаў, бяздумна падтрыманая дэпутатамі паслухмянага парламента, завяла краіну ў палітычны і эканамічны тупік.

БНФ мае праграму ўсебаковых рэформаў па прынцыпе «Не народ для ўрада, а ўрад для народа!», каб беларусы жылі годна і заможна ды былі сапраўднымі гаспадарамі на сваёй зямлі, каб нашы людзі не былі вымушаныя шукаць работы і лепшай долі ў замежжы.

Ніякіх новых зборaў і падаткаў! У новым складзе парламента не месца тым, хто раней уводзіў новыя падаткі і зборы, у тым ліку ганебны збор з непрацуючых.

Разумная прыватызацыя: ва ўласнасці дзяржавы застануцца толькі тыя прадпрыемствы, што маюць стратэгічнае значэнне.

Бар'еры для рэалізацыі беларусамі права ўласнасці на зямлю павінны быць знятыя, а правы ўласнікаў нерухомасці — надзейна абароненыя.

Дадзім свабоду ды падтрымку бізнесу, вызвалім яго ад адміністрацыйнага ціску, зменшым падаткі.

Дыверсіфікуем пастаўкі энерганосьбітаў для забеспячэння энергетычнай незалежнасці Беларусі.

Створым эканамічныя стымулы і ўмовы для вяртання беларусаў, якія працуюць за мяжой.

Прымем закон пра «Карту суайчынніка» для ўмацавання культурных, гаспадарчых і адукацыйных сувязяў з беларусамі замежжа.

Падтрымка сям'і дапаможа скараціць колькасць разводаў і абортаў, што нішчаць будучыню нацыі.

Спыненне алкагалізацыі насельніцтва — дзяржаўная задача.

Абарона навакольнага асяроддзя: развіццё ўзнаўляльных і альтэрнатыўных крыніц энергіі, інфраструктуры для электрамабіляў, энергаэфектыўная вытворчасць, закон пра абарону жывёл.

Бюджэт аховы здароўя трэба павялічыць да еўрапейскіх стандартаў, таксама развіваючы медычнае страхаванне. Людзям павінны быць даступныя як айчынныя, так і замежныя лекі.

Замест павышэння пенсійнага ўзросту — пераход да накапляльнай сістэмы, каб пенсійныя адлічэнні назапашваліся і выплачваліся пасля выхаду на пенсію, а сваякі пенсіянераў у выпадку іх смерці мелі права атрымаць у спадчыну недавыплачаную частку пенсіі.

Падтрымка роднай мовы, адукацыі і культуры: спыніць скарачэнне беларускамоўных школ, стварыць сістэму вышэйшай адукацыі на беларускай мове.

Размеркаванне студэнтаў — выключна на добраахвотнай аснове. Адтэрміноўкі ад вайсковай службы павінны даваць магчымасць моладзі атрымаць адукацыю.

БНФ выступае за адмену татальнай кантрактнай сістэмы.

Мы за вяртанне спрадвечных беларускіх сімвалаў: герба «Пагоня» і Бела-Чырвона-Белага сцяга.

Дэмакратыя, прававая дзяржава, падзел галін улады: законы павінны быць вышэйшыя за ўказы і дэкрэты, а суды — незалежныя ад выканаўчай улады і падпарадкаваныя толькі закону.

Цэнзура недапушчальная: свабода слова павінна быць гарантаваная для ўсіх СМІ і для інтэрнэту, людзі не павінны сядзець у турме за свае думкі, словы і перакананні.

Кіраўнікі выканкамаў павінны абірацца грамадзянамі на свабодных выбарах.

Барацьба з карупцыяй — прыярытэт: хто не краў — сядзець не будзе, а хто скраў — павінны быць пакараны.

Выйдзем з Еўразійскага саюза, які ёсць крыніцай праблем у эканоміцы, скасуем дамову пра «Саюзную дзяржаву», якая пагражае суверэнітэту Беларусі.

Створым бязвізавы рэжым з дзяржавамі Еўрасаюза.

Надзейная мяжа з Расіяй спыніць паток злачыннасці, нелегальнай міграцыі ды наркотыкаў.

Беларусь мусіць выйсці з Арганізацыі дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ), якая пагражае ўцягваннем нас ва ўзброеныя канфлікты ў Азіі. Замежныя вайсковыя аб'екты павінны быць выдаленыя з тэрыторыі краіны.

Далучым Беларусь да Сусветнай гандлёвай арганізацыі (WTO), каб адкрыць прадпрыемствам доступ на сусветны рынак, а беларусам даць доступ да якасных і танных тавараў.

З платформай партыі БНФ можна азнаёміцца на сайце www.narodny.org

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

31 КАСТРЫЧНІКА 2019 г.
ЧАЦВЕР
№ 19 (15874)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Лера ЯСКЕВІЧ:

«У МЯНЕ ВЕЛЬМІ ШМАТ ПЛАНАЎ НА БУДУЧЫНЮ»

Для таленавітага чалавека не існуе межаў. Галоўнае — жаданне рухацца наперад, любіць тое, чым ты займаешся і, вядома... наяўнасць інтэрнэту. Такой думкі прытрымліваецца маладая айчынная выканаўца і блогер Лера Яскевіч, якая пачынала сваю кар'еру з кавераў і відэаролікаў на YouTube, а цяпер гастралюе не толькі па Беларусі, але і за яе межамі. Напэўна, многіх прыхільнікаў яе творчасці цікавіць: як дамагчыся такога? Слова — куміру моладзі.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Роднае=моднае

МІФЫ, БОНСЦІКІ І БЕЛАРУСКАЯ МОВА

Важны жыццёвы ўрок — паверыць у сябе

«Добры дзень, паважаныя супрацоўнікі кампаніі. Я, Некраш Юлія Іванаўна, настаўніца беларускай мовы і літаратуры мінскай СШ № 54, хачу выказаць вам сваю ўдзячнасць за папулярызацыю беларускіх традыцый і міфалогіі з дапамогай апошняй калекцыі бонсцікаў «Міфы і легенды Беларусі».

Тэма, закранутая вамі, з'яўляецца вядучай праграмнай тэмай у вывучэнні беларускай літаратуры ў шостым класе. Улічваючы папулярнасць бонсцікаў, цікавасць гэтай узроставай групы да прапанаванай прадукцыі, я максімальна выкарыстоўвала яе на сваіх уроках як навучальны дапаможнік. Мы шмат малявалі, прыдумлялі, ляпілі і гулялі з вучнямі, а галоўнае — дзеці ВЕЛЬМІ палюбілі зусім новы прадукт — КНІГУ.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Анастасія Канапліцкая, Вікторыя Сініцкая, Юлія Некраш, Станіслава Харытонава, Ксенія Пакусаева і Ксенія Гнілеўская *(злева направа)*: «Усё ў нашых руках!»

Пазнаёміцца з прафесіяй

Хто найлепшы сябра кліента гатэля?

Дваццацітрохгадовы Багдан ЦІХАНОВІЧ добра ведае свой горад і памятае звычкі пастаянных гасцей. Ён імкнецца зрабіць часовае пражыванне пастаяльцаў незабыўным і ўвасабляе ў жыццё любыя іх пажаданні. Хлопец працуе кансьержам у адным са сталічных пяцізоркавых гатэляў. Што ўяўляе з сябе гэтая рэдкая для краіны прафесія? Пра гэта мы даведаліся ў нашага суразмоўніка.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

— У Беларусі няма спецыяльнай установы, дзе рыхтуюць кансьержаў, — кажа Багдан. — Не ўсе гасцініцы хочуць мець у сябе гэтую пазіцыю — вялікую частку абавязкаў звычайна выконвае адміністратар. Таму і прадстаўнікоў прафесіі ў сталіцы няшмат — нас усяго пяць чалавек.

Пасля вучобы ў школе асноўнай мэтай для сталічнага хлопца было ўдасканаленне валодання англійскай мовай. Таму ён паступіў у Лінгвагуманітарны каледж. Калі надышоў час праходзіць першую практыку, уладкаваўся ў гасцініцу афіцыянтам. Але выйсці на змену так і не атрымалася — пазнаёміўся з кансьержам, які хутка прапанаваў стаць яго памочнікам.

— Менавіта гэта прафесія мяне вельмі зацікавіла, таму застаўся ў гасцініцы на некаторы час. Паралельна завочна атрымліваў вышэйшую адукацыю ў Лінгвістычным універсітэце. Зараз я аддаў перавагу пяцізоркаваму гатэлю ў цэнтры Мінска, у ім працую больш за год, і ў найбліжэйшай будучыні хачу развівацца менавіта тут, — працягвае хлопец.

— Як выглядае твой рабочы дзень?

— Усе абавязкі можна падзяліць на дзве часткі. Першая — штодзённая руціна: арганізацыя дзелавых сустрэч, экскурсій па горадзе, рэзерваванне столікаў у рэстаране, браніраванне квіткоў, трансферы, праверка пошты, адказы на званкі. Але ёсць і тыя, што «з разынкай». Яны складаюць другую частку абавязкаў — гэта незвычайныя пажаданні пастаяльцаў. Адмаўляць ім мы не маем права, акрамя тых запытаў, якія супярэчаць закону. Аднойчы для госця гатэля я адшукаў школьнае каханне. З адной дзяўчынай ён 30 гадоў таму разам вучыўся. З прадстаўленай інфармацыі былі толькі імя і прозвішча. На жаль, у сацсетках кантакту жанчыны не аказалася, прыйшлося скарыстацца тэлефонным даведнікам. Трубку падняў яе бацька, даў кантакт дачкі. Дагэтуль не ведаю, ці сустрэліся былыя закаханыя ці не, але было прыемна чуць словы падзякі.

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
31 10 2019 г.

МІФЫ, БОНСЦІКІ І БЕЛАРУСКАЯ МОВА

За апошнія 13 гадоў працы ў школе я не памятаю падручніка, з якім навучэнцы так захоплена працавалі б. Яны перачыталі яго ўздоўж і ўпоперак, практычна кожны мой вучань пажадаў набыць гэтую кнігу. А яна, паверце, дала ім больш ведаў, чым школьны падручнік. Педагогам, настаўнікам-метадыстам, аўтарам-складальнікам школьных падручнікаў ёсць чаму ў вас павучыцца.

Але ёсць і адзін недахоп. Дзеці самі звярнулі на яго ўвагу, а яны, як вы добра ведаеце, з'яўляюцца самымі шчырымі вашымі спажыўцамі. Малыя палічылі, што кніга была б нашмат цікавейшай на роднай мове. Адпаведна, мы выдатна папрацавалі і стварылі пераклад. Будзем рады прапанаваць вам беларускамоўны варыянт кнігі. Гэта дасць магчымасць стварыць сапраўды ўнікальны прадукт на тэрыторыі краіны, аналага якому на сённяшні дзень не існуе. Не кажучы ўжо пра тое, якую істотную ролю вы адыграеце ў папулярызацыі беларускай мовы і культуры. Упэўнена, што ў чалавека, які чытае гэты ліст, ёсць (альбо былі) дзеці-школьнікі. Успомніце, як складана даваліся ім урокі беларускай мовы і літаратуры! У нас ёсць магчымасць ім дапамагчы.

Я, як настаўнік беларускай мовы і літаратуры, адкрыта для супрацоўніцтва і палічу за гонар папрацаваць з такой знакавай і аўтарытэтнай кампаніяй».

Прыкладна год таму такі ліст атрымала ад школьнай настаўніцы кампанія «Еўрагандаль», якая выдала ілюстраваную энцыклапедыю з элементамі дадатковай рэальнасці, прысвечаную беларускай міфалогіі.

За кожнай старонкай рукапіснай кнігі з малюнкамі бачны характар, стыль і тэмперамент кожнай з юных перакладчыц.

ПЯЦЁРКА АДВАЖНЫХ

Хут, Хатнік, Вазіла, Баган, Агнявік, Гуменнік, Пуннік, Еўнік, Дамася, Паднор, Баламуцень, Жэўжык, Жыж, Вастроха... Ці ведаеце вы, пра каго ідзе гаворка?

— Прызнаюся, што я хоць і вывучала міфалогію беларусаў як асобны прадмет, многія са згаданых герояў нават мне былі незнаёмыя, — расказвае аўтар ліста Юлія НЕКРАШ. — Пачала шукаць інфармацыю і пераканалася, што ў многіх даследчыкаў гэтыя героі згадваюцца. Таму выданне мае добры навуковы падмурак. Але ўсе звесткі ў ім настолькі цікава і па-сучаснаму пададзены, што мае вучні былі проста ў захапленні.

Урокі перакладу з рускай на беларускую мову — традыцыйна самыя сумныя і складаныя ў школьнай праграме. Тэксты, якія прапануюцца, нецікавыя дзецям. І гэта вечная праблема: як зрабіць заняткі больш жывымі? І тут раптам такі падарунак лёсу! Я дала на ўроку сваім шасцікласнікам некалькі пробных тэкстаў з энцыклапедыі «Героі міфаў і легенд Беларусі». У сярэднім вучню, каб знайсці пераклад слова ў папяровым слоўніку, патрабуецца 1,5—2 хвіліны, а лексічны запас у сучасных дзяцей, на жаль, вельмі абмежаваны. Таму за ўрок школьнік паспявае якасна перакласці толькі некалькі сказаў. На дапамогу нам прыходзіць руска-беларускі анлайн-перакладчык «Белазар», мы свядома прыбягаем да сучасных інфармацыйных тэхналогій, бо час — самы каштоўны рэсурс, якім трэба ўмець рацыянальна карыстацца. Канешне, мы ведаем усе хібы электронных перакладчыкаў і стараннa іх выпраўляем. Ідэя перакласці ўсю энцыклапедыю (90 старонак) узнікла неяк спантанна: так наш урок нечакана перайшоў на канікулярны час.

Падчас восеньскіх вакацый пяць дзяўчат — на той момант вучаніцы 6 класа **Ксенія ГНІЛЕЎСКАЯ, Анастасія КАНАПЛІЦКАЯ, Ксенія ПАКУСАЕВА, Вікторыя СІНІЦКАЯ і Станіслава ХАРЫТОНАВА** — працавалі ў школьнай бібліятэцы па восем-дзевяць гадзін. Плюс займаліся яшчэ і мастацкім афармленнем перакладу. Дзяўчат нават даводзілася прымушаць пайсці дамоў, каб штосьці там перакусіць, бо сталовая на канікулах не працавала.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Дванаццаць выдатных коміксаў у падтрымку роднай мовы былі створаны ўсяго за два тыдні чацвёртай чвэрці.

— Яны настолькі самаддана ўключыліся ў гэту работу, і створаная імі рукапісная кніга, якую мы затым адсканавалі, атрымалася настолькі ўдалая і дарагая асабіста мне, бо за кожнай старонкай з малюнкамі бачны характар, стыль і тэмперамент кожнай з іх, — што я рашылася, так бы мовіць, на авантуру — склала ліст у кампанію «Еўрагандаль», — прызнаецца настаўніца. — Адказ на яго прыйшоў вельмі хутка. Нам падзякавалі за пахвальны водгук пра кнігу і паведамілі, што мы закранулі вельмі важную тэму — родную мову ў камунікацыі кампаніі. Першапачткова быў намер друкаваць тыраж і на беларускай, аднак даследаванні паказалі стрымана негатыўнае стаўленне да яе ў рэгіёнах. Калі казаць простымі словамі, то ў буйных гарадах мова перажывае рэнесанс — яе падтрымлівае маладая і прагрэсіўная частка грамадства. А вось у рэгіёнах, у сельскай мясцовасці, ёсць «комплекс беларускай мовы». А паколькі кампанія працуе на ўсёй тэрыторыі краіны, а не толькі ў гарадах, было прынятае важнае для бізнесу рашэнне — друкаваць тыраж толькі па-руску. Ці было расчараванне? Літаральна праз пару дзён прыйшло паведамленне наступнага зместу: «Юлія Іванаўна! Нас вельмі крануў ваш ліст. Сёння яго абмяркоўвалі з кіраўніцтвам кампаніі. У выніку мы прынялі рашэнне выдаць дадатковы тыраж на беларускай мове. Мы хацелі б таксама прыцягнуць вас і вашых вучняў да падрыхтоўкі гэтай кнігі. Калі ваша прапанова па перакладзе ўсё яшчэ ў сіле, то мы з задавальненнем ёй скарыстаемся і абавязкова згадаем вас у выхадных даных. Калі ласка, напішыце пра сваё рашэнне і фармат, у якім вам было б зручна супрацоўнічаць».

Напэўна, усё ж такі для таго, каб дзверы адчыніліся, трэба паспрабаваць у іх пастукаць. У настаўніцы і яе вучаніц гэта атрымалася. Праўда, ім давялося тэрмінова набіраць увесь тэкст яшчэ і на камп'ютары. Але намаганні не былі дарэмныя: напярэдадні каталіцкіх Калядаў энцыклапедыя «Героі міфаў і легенд Беларусі» выйшла 10-тысячным тыражом на роднай мове. І сваё абяцанне ў кампаніі стрымалі: усе прозвішчы юных перакладчыкаў у кнізе згадваюцца.

«Для нас усіх гэта быў каласальны вопыт, — прызнаецца Юлія Некраш. — Па-першае, дзеці ўзбагаціліся ў плане міфалогіі, па-другое, набылі вопыт мастацкага перакладу, па-трэцяе, навучыліся камандным рабоце. Паверце, гэта было праблемай для класа, у якім усе «зоркі», усе лідары, кожны — яркая індывідуальнасць. Прымусіць іх працаваць разам у камандзе — вельмі праблематычна. А ў кнізе, якую падрыхтавалі дзяўчаты, ёсць старонкі, работу над якімі распачынала адна, а падхоплівала іншая. Быў і яшчэ адзін важны жыццёвы ўрок: дзеці звычайна не вераць, што яны могуць змяніць свет, а кніга дала ім веру ў тое, што гэта магчыма. Але я вымушана ім цяпер казаць, што двойчы ў адну ваду ўвайсці немагчыма, таму трэба далей шукаць новыя спосабы для сваёй самарэалізацыі... Але яны ўжо сталі кумірамі для маіх пяціклашак».

ЗАЧАПІЦЬ ПАТРЭБНУЮ СТРУНКУ

Ёсць у настаўніцы з 54-й сталічнай школы яшчэ адна пакуль не ўвасобленая ў жыццё ідэя — выпусціць каляндар з коміксамі ў падтрымку роднай мовы, якія намаляваў яе выпускніца.

— У папярэднім навучальным годзе ў 11 класе ў мяне была вучаніца **Паліна БУЯК**, якой беларуская мова была ну абсалютна не блізкая. Яна абуралася, навошта прадмет увогуле ўключылі ў праграму? Казала, лепш бы адмянілі гэтыя ўрокі, бо ўсё роўна на ёй ніхто не размаўляе. Стала я думаць, як знайсці падыход. Заўважыла выдатныя мастацкія здольнасці ў дзяўчыны і прапанавала намаляваць у жанры коміксаў тое, што яе хвалюе. Кажу: «Давай мы разам знойдзем моманты, калі б ты магла зрабіць свой выбар на карысць роднай мовы, ад чаго-небудзь адштурхнёмся». І яна пачала шукаць. Напрыклад, якую мову мы выбіраем у банкамаце? Як устанавіць беларускую клавіятуру на смартфоне? Дзе адшукаць «ў» на камп'ютарнай клавіятуры? Затым прыдумала персанажа Юрасіка і яго сям'ю. З чаго пачаць размаўляць на роднай мове? З такіх слоў, як «добрай раніцы», «дабранач», «смачна есці»... А што азначае слова «коцікі», якое ёсць толькі ў беларускай мове? Паліну вельмі ўзрушыў верш Алеся Разанава «На заінелым трамвайным акне хтосьці напісаў: «Я кахаю». Усе пазіраюць на свет праз гэтыя словы...» І яна таксама яго адлюстравала. Дванаццаць выдатных малюнкаў былі створаны ўсяго за два тыдні чацвёртай чвэрці.

У школе арганізавалі выстаўку яе работ з QR-кодамі, яна стала вельмі папулярнай дзяўчынай. Сітуацыя поспеху, напэўна, стала пераломным момантам і Паліна... пачала размаўляць на роднай мове. Краіна набыла яшчэ адну беларускамоўную дзяўчыну. Сёння яна вучыцца кіраваць інавацыйнымі праектамі ў БНТУ і, напэўна, побач аказаліся людзі, якія былі з ёй на адной хвалі, але факт застаецца фактам — беларуская мова стала для яе сродкам штодзённых стасункаў. А я мару, каб знайшоўся зацікаўлены чалавек, які паклаў бы яе работы на паліграфічную аснову.

СМАРТФОН — СЯБРА ЦІ ВОРАГ?

— А ці патрэбны на ўроку план В? — пацікавіліся мы ў настаўніцы.

— Калі ў цябе сядзіць у класе 30 чалавек, павінен быць не толькі план В, але і план С, — усміхаецца Юлія Іванаўна. — Трэба мець на ўвазе ўсё: пасля якога ўрока да цябе прыходзяць дзеці, які гэта клас, ці ёсць там унутраныя канфлікты і супярэчнасці, і толькі настаўніцкі вопыт дае мне магчымасць кантраляваць і рэгуляваць усе гэтыя працэсы. На жаль, але ў школьнай праграме вельмі мала сучаснай беларускай літаратуры, якая магла б зачапіць дзяцей. Напрыклад, навелу Уладзіміра Сцяпана «Адна капейка» праходзяць толькі ў 11 класе, а яна цікавая больш сямікласнікам, чым старшакласнікам. У сёмым-восьмым класе для вучняў вельмі важныя маральна-этычныя аспекты. Гэта пераходны ўзрост, калі яны шукаюць адказы на многія пытанні і знаходзяць іх не заўсёды там, дзе трэба. Між іншым, у нас ёсць цудоўная літаратура... Падлеткі заўсёды вельмі добра ўспрымалі «Бацьку» Рыгора Барадуліна, настолькі кранаў іх гэты твор, настолькі ён быў ім зразумелы, але яго знялі са школьнай праграмы. Увогуле, дзеці вельмі здзіўляюцца, калі ім кажаш, што ты знаёмы з кімсьці з пісьменнікаў. «Як гэта? Юлія Іванаўна, а колькі ж вам гадоў? Вы быццам бы яшчэ маладая?» Для іх беларуская літаратура, на жаль, не асацыюецца з сённяшнім днём. Гэта штосьці з іншай рэчаіснасці...

Для мяне, як для настаўніка, які выкарыстоўвае на ўроку інфармацыйныя тэхналогіі, вучыць карыстацца «Белазарам», рабіць тэксты ў Гугле, алічбоўваць іх, проста катастрофа — забараніць на ўроку гаджэты. Ну давайце яшчэ лямпачкі павыкручваем і свечкі запалім...

На 1200 вучняў у школе закуплена 20 планшэтаў. У нас ва ўсіх кабінетах ёсць інтэрнэт, але да яго падключаны толькі камп'ютар настаўніка. **Мяркую, што забарона мабільных тэлефонаў — гэта панацэя для педагогаў, якія не могуць утрымаць увагу дзіцяці на ўроку.** А я лічу, што трэба павярнуць сітуацыю ў свой бок, і зрабіць так, каб тое, што перашкаджала, дапамагло. Я тлумачу калегам, як можна выкарыстоўваць разнастайныя вэб-інструменты, трэба толькі крышачку пасядзець і разабрацца ў іх. І дзеці гэта вельмі любяць. QR-коды для маіх вучняў — добра знаёмы элемент. Раней я хатнія заданні хавала за QR-кодамі...

На жаль, заданні створаныя для выкарыстання праз вэб-інструменты, вельмі спрошчаныя і разлічаны на рэпрадуктыўны ўзровень. Калі ты жадаеш стварыць нешта больш якаснае, трэба садзіцца і стварыць заданні да ўроку асабіста. Настаўнікі, прадметы якіх супадаюць з праграмай Расіі ці Украіны, знаходзяцца ў больш выгадным становішчы. Для іх зроблена ўжо вельмі шмат — толькі бяры і прымяняй...

Я шмат сваёй энергіі растрачваю на размовы з бацькамі і тлумачэнні, чаму сёння дзяцей трэба вучыць інакш? Спрабую пераконваць і сваіх калег. Кажу: «Уявіце сабе, што трэба тэрмінова зрабіць аперацыю. Што вы выбераце: поласцевую ці лапараскапічную? Чаму медыкі з лёгкасцю пагаджаюцца на новыя тэхналогіі і рухаюцца наперад, а настаўнікі застаюцца кансерватарамі?»

Каб застрахавацца ад прафесійнага самавыгарання, прымушаю сябе раз на паўгода распрацаваць нейкі вельмі цікавы ўрок для дзяцей, майстар-клас ці ўрок для дарослых. Калі бачу вочы дзяцей, гэта мне вельмі дапамагае. На сваіх уроках я часта стаўлю відэакамеру, каб паглядзець на сябе збоку. Настаўнік, як правіла, уяўляе сябе Богам у класе (мяркую па сабе, нікога не хачу пакрыўдзіць). Ты самы разумны, усё ведаеш, а дзеці становяцца проста матэрыялам. А калі праглядаеш відэа, то бачыш іх душы і сэрцы, бачыш, што тут некага пакрыўдзіў, хтосьці цэлы ўрок трымаў руку, а ты яго не заўважаў. Гэта дае каласальны эфект, атрымліваецца проста суперрэфлексія.

Прафесійна «не згарэць» мне дапамагаюць таксама метадычны летнік у Альхоўцы і EdCamp Belarus, дзе збіраюцца самыя неабыякавыя і творчыя педагогі. Я вучуся ў іх і маю гонар быць з імі знаёмая...

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Сваё месца

Размеркаваннем задаволены!

Сёлета 99,9 працэнта выпускнікоў ВНУ бюджэтнай формы навучання атрымалі першыя рабочыя месцы. Былі размеркаваны 18 тысяч чалавек. Пра гэта паведаміла кансультант галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Вольга МУШЧЫНСКАЯ.

— Былыя навучэнцы сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў таксама іх знайшлі — усяго 18,5 тысячы, што зноў жа склала 99,9 працэнта. У сферы прафесійна-тэхнічнай адукацыі падрыхтавана 26 тысяч маладых рабочых і служачых, 99,8 працэнта былі забяспечаны першым рабочым месцам. Дарэчы, яшчэ падчас навучання каля 75 працэнтаў такіх навучэнцаў атрымліваюць дзве і больш кваліфікацыі, гэты фактар значна павышае іх канкурэнтаздольнасць і запатрабаванасць на рынку працы, — адзначыла кансультант.

Замацаванне маладых спецыялістаў на першых рабочых месцах — асноўная задача для ўсіх галін эканомікі. Там, дзе ствараюцца адпаведныя ўмовы — вырашаюцца пытанні з жыллём і заробкам, забяспечваецца прафесійны рост — яны застаюцца.

— Пасля адпрацоўкі па размеркаванні да 70 працэнтаў выпускнікоў ВНУ і ССНУ працягваюць шчыраваць далей на выдзеленых ім першых рабочых месцах. Сярод педагагічных работнікаў працэнт тых, хто замацаваўся, складае ад 70 да 98 у залежнасці ад рэгіёна, — зазначыла **кансультант галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Таццяна АРЦЕМ'ЕВА.**

Асаблівая ўвага аддаецца выпускнікам з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Сёлета 619 такіх маладых людзей знайшлі сваё першае рабочае месца, 11 чалавек па медыцынскіх паказаннях атрымалі права на самастойнае размеркаванне.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Кансультант галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Таццяна КАРАТКЕВІЧ расказала, што кожны год некаторая колькасць маладых спецыялістаў з шэрагу прычын не прыступае да працы па выдадзеных пасведчаннях аб накіраванні на работу. Аднак такіх не вельмі многа, па папярэдніх звестках, у бягучым годзе толькі 0,7 працэнта выпускнікоў ВНУ, 0,8 працэнта — каледжаў і 1,5 працэнта спецыялістаў, якія скончылі прафесійныя тэхнічныя ўстановы адукацыі, не захацелі ўладкоўвацца на выдзеленыя першыя рабочыя месцы.

— Гэтыя паказчыкі нязначныя, і штогод яны прыкладна аднолькавыя. Кампенсаваць грашовыя сродкі дзяржаве — гэта крайняя мера. Заўсёды ёсць магчымасць пераразмеркавацца або ўзяць перанакіраванне. Міністэрства адукацыі працуе ў інтарэсах як галін эканомікі, так і ў інтарэсах выпускнікоў, — адзначыла Таццяна Караткевіч. — Калі будзе змяняцца сітуацыя — будзе змяняцца і заканадаўства ў гэтай сферы. Размеркаванне для маладога спецыяліста — гэта і сацыяльная гарантыя, і атрыманне вопыту работы, важнага для далейшай кар'еры.

— Штогод 100 працэнтаў выпускнікоў бюджэтнай формы навучання медыцынскіх універсітэтаў і каледжаў атрымліваюць свае першыя рабочыя месцы. 90 працэнтаў выпускнікоў платнай формы навучання таксама бяруць накіраванне на размеркаванне, — расказала **начальнік упраўлення кадравай палітыкі, устаноў адукацыі Міністэрства адукацыі Вольга МАРШАЛКА.** — Мы за тое, каб выпускнік быў цалкам задаволены сваім першым рабочым месцам. Даведку аб свабодным працаўладкаванні можа ўзяць любы студэнт, але карыстаюцца гэтай магчымасцю нямногія. Каля 80 працэнтаў выпускнікоў медыцынскіх універсітэтаў і каледжаў задаволены месцам размеркавання, такі ж працэнт і тых, хто працягвае шчыраваць на ім і пасля адпрацоўкі.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

У зоне ўвагі

АД СВАВОЛЬСТВА — ДА КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ

У Віцебску падлеткі скралі з вулічнага халадзільніка марожанае. У Буда-Кашалёўскім раёне ліцэіст угнаў «Амкадор». На станцыі Памыслішча кампанія маладых людзей каталася на хваставым вагоне цягніка. У Гомелі хлопцы «выпрабавалі» электрашокер на школьніках. Цяпер за сваю дзікунскую выхадку хуліганам давядзецца несці адказнасць...

— Амаль кожны дзень дзеці і падлеткі з прычыны неналежнага кантролю за імі трапляюць у розныя небяспечныя сітуацыі. Аператыўная абстаноўка ў верасні характарызавалася далейшым ростам колькасці злачынстваў, здзейсненых непаўналетнімі, — канстатуе **начальнік аддзела арганізацыі работы інспекцый па справах непаўналетніх міліцыі грамадскай бяспекі МУС палкоўнік Сяргей ЯНКОЎСКІ.** — За дзевяць месяцаў бягучага года быў адзначаны рост махлярстваў, павялічылася колькасць угонаў транспартных сродкаў, крадзяжоў з выкарыстаннем камп'ютарнай тэхнікі. А колькасць злачынстваў, звязаных з незаконным абаротам наркатычных рэчываў, вырасла за дзевяць месяцаў удвая ў параўнанні з адпаведным перыядам 2018 года — з 63 да 129.

Крадзеж застаецца самым распаўюджаным злачынствам у агульнай колькасці супрацьпраўных дзеянняў, здзейсненых непаўналетнімі. Пакінуты ў грамадскім месцы тэлефон можа вельмі хутка займець новага гаспадара. Таксама дзеці карыстаюцца няўважлівасцю дарослых. Здараецца, што падлеткі ўгаворваюць старэйшых сяброў ці знаёмых набыць ім у крэдыт гаджэт. І як бы парадаксальна гэта ні выглядала, але дарослыя не задумваюцца, адкуль потым у прасіцеля возьмуцца грошы на яго вяртанне...

Сур'ёзнай спакусай для непаўналетніх з'яўляецца выпадкова пакінуты ў аўтамабілі ключ ці заведзены транспартны сродак.

Пачасціліся таксама выпадкі, калі падлеткі карыстаюцца знойдзенай банкаўскай карткай. Напрыклад, у адным з мінскіх гіпермаркетаў непаўналетнія падабралі карту, якая не патрабавала ўвядзення пін-кода, і некалькі дзён запар разлічваліся ёй у рэстаране хуткага абслугоўвання.

«Сёння мы назіраем уцягванне падрастаючага пакалення ў распаўсюджванне наркотыкаў і фарміраванне пранаркатычнай свядомасці праз інтэрнэт. Гэта адбываецца ў сацыяльных сетках і на пляцоўках сумніўных рэсурсаў, дзе ладзяцца акцыі ў падтрымку і легалізацыю марыхуаны, папулярызуюцца так званыя наркатычныя вечарынкі. Ідзе агрэсіўная рэклама хуткага і высокага заробку, у ход ідуць механізмы сеткавага маркетынгу, абяцанні зарабляць неблагія грошы без прывязкі да канкрэтнага месца і часу, — падкрэслівае Сяргей Янкоўскі. — У шэрагу выпадкаў падлеткі, якія здзяйсняюць той ці іншы ўчынак, нават не задумваюцца пра яго грамадскую небяспеку. Напрыклад, хлопец мадыфікаваў інфармацыю ў сацыяльнай сетцы на старонцы сваёй сяброўкі. Ён палічыў, што нічога страшнага не адбылося, тым больш што сам дапамагаў яе ствараць, ведаў пароль... Але дзяўчына звярнулася ў міліцыю. Дзеянні гэтага падлетка кваліфікуюцца як крымінальныя.

Практычна палова ўсіх злачынстваў здзяйсняецца навучэнцамі ліцэяў і каледжаў. На долю школьнікаў і гімназістаў прыпадае трэцяя частка. 23 працэнты злачынстваў адбываюцца ў вучэбны час, з панядзелка да пятніцы з 8 гадзін раніцы і да 15 гадзін, калі падлеткі павінны быць на занятках. Па-ранейшаму значная колькасць злачынстваў з удзелам непаўналетніх здзяйсняецца ў начны час. І каля 31 працэнта злачынстваў з удзелам непаўналетніх адбываюцца ў выхадныя. «Хацелася б звярнуць увагу бацькоў, што ўскладаць абавязкі па забеспячэнні бяспекі дзяцей толькі на школу ці міліцыю не варта, бо менавіта ў сям'і закладваюцца асновы выхавання», — падкрэсліў Сяргей Янкоўскі.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Прарэктар па навукова-метадычнай рабоце Мінскага гарадскога інстытута развіцця адукацыі Аксана ТАЛКАЧОВА таксама ўпэўненая: у работу па фарміраванні прававой свядомасці моладзі павінны быць уцягнутыя ўсе — бацькі, органы МУС, навучальныя ўстановы, а таксама грамадскія дзіцячыя і маладзёжныя арганізацыі.

— Адзін з перспектыўных кірункаў прафілактыкі — укараненне медыятыўных тэхналогій у сістэму адукацыі. У Мінску працуе ўжо 11 школьных службаў медыяцыі, — расказала прадстаўнік сістэмы адукацыі. — На працягу навучальнага года школьнікі ўдзельнічаюць у семінарах і форумах, навучаюцца, а калі хто-небудзь з іх аднагодкаў аказваецца ў крызіснай сітуацыі, прымяняюць свае веды на практыцы. Праект выдатна зарэкамендаваў сябе ў Мінску, а з гэтага навучальнага года будзе распаўсюджвацца і ў рэгіёнах.

Яшчэ адна новая форма работы, скіраваная на прафілактыку правапарушэнняў, — адкрыццё мабільных пакояў для моладзі. Такія ўжо з'явіліся на базе пяці мінскіх устаноў адукацыі дзякуючы сумеснаму нямецка-беларускаму праекту.

Сёння дзеці могуць апынуцца на вуліцы з розных прычын, у тым ліку і з-за праблем ва ўласнай сям'і. Ім не хочацца ісці дамоў, большую частку свайго часу яны праводзяць з кампаніяй у дварах ці ідуць з сябрамі ў гандлёвыя цэнтры. Нават па самай аптымістычнай статыстыцы, аб'яднаннямі па інтарэсах ахоплены толькі кожны трэці школьнік.

А мабільны пакой — тое месца, куды ў пазавучэбны час заўсёды можна прыйсці без нейкай канкрэтнай мэты, каб проста пабыць у цяпле, пагуляць у настольныя гульні, паглядзець тэлевізар або зрабіць урокі ў цішыні. Для таго, каб наведаць пакой, не трэба нідзе загадзя рэгістравацца ці запісвацца, дастаткова проста ўзяць ад яго ключ. Можна прыйсці з сябрам з іншай школы. Калі ў дзяцей пацікавіліся, як бы яны хацелі бавіць свой вольны час, прычым пыталіся ў групы школьнікаў, не ахопленых заняткамі па інтарэсах, большасць з іх выбралі стасункі ў нейкім месцы, але галоўнай іх умовай была адсутнасць дарослых! Дзеці самі выпрацоўваюць правілы паводзінаў. У гэтых пакоях могуць працаваць валанцёры з цэнтра сяброўскага стаўлення да падлеткаў, але ніякага плана выхаваўчай работы няма. Толькі калі дзеці адчуюць сябе ў камфорце і бяспецы, можна ненавязліва і непрыкметна праводзіць сярод іх прафілактычную работу.

Мабільныя пакоі дзейнічаюць у сталіцы на базе сярэдніх школ № 208, № 9, цэнтра дадатковай адукацыі «Вікторыя», СПЦ Партызанскага раёна і ў цэнтры сяброўскага стаўлення да падлеткаў «Давер» на базе 8-й гарадской дзіцячай паліклінікі.

Напрыканцы 2017 года ў інтэрнэце быў запушчаны інфармацыйны рэсурс pomogut.by, дзе можна знайсці шмат карыснай інфармацыі і па бяспецы ў інтэрнэце, і па булінгу, і па нарказалежнасці. Як своечасова разглядзець у дзіцяці наркамана? Куды звяртацца і хто можа дапамагчы? Якая адказнасць прадугледжана за распаўсюджанне наркотыкаў? На гэтыя і многія іншыя пытанні ёсць адказы на сайце...

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
31 10 2019 г.

Камертон настрою

ЗМЯНЯЮЧЫ ЛЯЛЬКУ, ЗМЯНЯЦЬ СЯБЕ

Свет захапленняў не мае межаў. Гэта тое, чым нам хочацца займацца ў вольны час, тое, што робіць жыццё больш яркім і пазбаўляе ад паўсядзённай руціны. Хтосьці ўжо знайшоў сябе і сваё хобі, а нехта працягвае эксперыменты і пошук нечага па душы. А калі гэтага раптам не здарыцца, можна самому... прыдумаць новы від творчасці!

Так, наша гераіня Анастасія Аляхновіч, выпускніца факультэта замежных моў БрДУ імя А. С. Пушкіна, купляе гатовыя лялькі, затым... сцірае ім твары і малюе новыя. Такая ідэя ўзнікла ў дзяўчыны даўно.

З самага дзяцінства Насця любіла маляваць. Спачатку гэта былі даволі дробныя работы, але, набіраючыся вопыту, яна стала пераходзіць да больш маштабных. Замест малявання звычайным алоўкам занялася вывучэннем акварэльнага жывапісу, стала рабіць партрэты і кампазіцыі, а таксама працаваць пры дапамозе графічнага планшэта.

Як правіла, мастацкая дзейнасць цягне за сабой іншыя творчыя працэсы. У нейкі момант Насця зразумела, што выяўленчае мастацтва — яе стыхія, і задумалася аб стварэнні чагосьці свайго, незвычайнага. Кожны раз, гледзячы на лялькі, дзяўчына думала, які новы вобраз яна падарыла б той ці іншай.

— Для мяне звычайныя лялькі, якія стаяць у скрыначках у крамах, аднолькавыя і нават сумнаватыя, — дзеліцца сваімі думкамі Анастасія. — Менавіта таму аднойчы я вырашыла паспрабаваць з адной з іх зрабіць іншую. Аказалася, што гэта вельмі захапляльны занятак! Часам бывае, што ты натхняешся нейкімі вобразамі і хочаш перадаць іх, але проста малюнак — неяк банальна. Іншая справа — лялькі. Яны аб'ёмныя, іх можна памацаць.

Тое самае натхненне дзяўчына чэрпае з работ іншых. Цяпер многія творчыя асобы займаюцца пераробкамі лялек. А якасна і добра зробленая работа не можа не выклікаць эмацыянальны водгук у душы. Раней Анастасіі падабалася вышываць і з цягам часу яна пачала ствараць уласныя цацкі. Робіць іх ад пачатку і да канца: знаходзіць матэрыял, сшывае, потым малюе твары. Майстрыха супрацоўнічае з некаторымі крамамі і вядзе групу сваёй творчасці ў сацыяльнай сетцы «УКантакце».

Вядома, стварэнне чагосьці новага — вялікая праца. Нярэдка Анастасіі даводзіцца самой рабіць ляльках прычоскі, адзенне, упрыгажэнні. Часам на іх малюе нават татуіроўкі. А нядаўна дзяўчына пачала ствараць для кожнай сваёй цацкі спецыяльную падарункавую скрынку.

Работы Анастасіі бачаць не толькі знаёмыя і падпісчыкі яе групы, але і незнаёмцы. Яна ўдзельнічала ў шматлікіх мастацкіх конкурсах. Прыдумляла мадэль пакоя творчага чалавека, асобна малявала мэблю, шпалеры і многае іншае. Таксама шыла конкурсную сукенку для лялькі ў выглядзе ласунку, стварала каляровыя калготкі ў крапінку і галаўны ўбор — торт на галаве. Выглядала ўсё даволі незвычайна. Анастасія атрымлівала прызавыя месцы, хоць для яе было вялікай радасцю тое, што яна проста магла паўдзельнічаць у конкурсе і праявіць сябе.

Нягледзячы на тое, што суразмоўніца скончыла факультэт замежных моў, яна марыць, каб яе хобі стала асноўным відам дзейнасці. Займаючыся выяўленчым мастацтвам, майстрыха не хоча спыняцца толькі на гэтым. Дзяўчыну таксама прыцягвае прафесія мультыплікатара і сам працэс стварэння анімацыйных фільмаў. А яшчэ — прафесія дыктара. Работа з голасам, выразна пастаўленая гаворка, артыстычнасць — усё гэта вабіць Насцю.

— Важна толькі правільна распланаваць свой час, — раіць яна. — Тады з'явіцца час і для вучобы, і для любімых заняткаў.

Вядома, без працы ноччу не абыходзілася. Бывала, творчы працэс настолькі зацягваў, што Насця не заўважала, як увечары садзілася за работу, а заканчвала толькі пад раніцу.

Дзяўчына заўсёды ідзе да сваёй мэты і ніколі не здаецца. Лічыць важным не апускаць рукі, а працаваць і ўдасканальвацца. Тады і канчатковы вынік абавязкова парадуе!

Ілона ПАПОВА,
студэнтка III курса
філалагічнага факультэта БрДУ
імя А. С. Пушкіна.

Хто найлепшы сябра кліента гатэля?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Чула, што сярод кансьержаў існуе такое паняцце, як «Служба праз сяброўства»...

— Сувязі і карысныя знаёмствы — тут ледзь ці не самае галоўнае. З усімі калегамі знаходжуся ў добрых адносінах, у нас нават ёсць мабільны чат, куды паведамляем важную інфармацыю накшталт: «У гэтым рэстаране не вельмі смачна гатуюць, нікога туды не пасылайце», і наадварот. Калі трэба тэрмінова знайсці нейкі кантакт або даставіць падарунак, напрыклад, у Вільнюс, прашу дапамогі ў замежных калег — яны не адмаўляюць, нават у нерабочы час.

«Я дагэтуль сутыкаюся з тым, што людзі не ведаюць, хто такі кансьерж. Часам пытаюцца: «Ты дзверы ў гатэлі адчыняеш?»

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Багдан дзеліцца, што ў рабоце яму вельмі дапамагаюць камунікабельнасць, стрэсаўстойлівасць і павага да людзей.

— Кансьерж — гэта той, хто не саромеецца завесці размову з любым госцем гатэля. Бо пастаяльцы бываюць розныя, і трэба ўмець кантраляваць свае эмоцыі. Вядома, часам свой характар даводзіцца стрымліваць, праяўляць цярпенне. Мяне не сустрэнеш у гатэлі ў дрэнным настроі, я заўсёды ветлівы. Працаваць толькі дзеля грошай — лічу, дрэнная ідэя, так доўга на службе не пратрымацца, хутка наступіць эмацыянальнае і прафесійнае выгаранне.

«Мяне не сустрэнеш у гатэлі ў дрэнным настроі, я заўсёды ветлівы».

— Як часта за работу табе кажуць «дзякуй»?

— Амаль заўсёды. Бо кожны з кансьержаў імкнецца зрабіць так, каб госці прыехалі да нас ізноў. Трэба вывучаць звычкі пастаяльцаў гасцініцы, умець прадбачыць, што ім неабходна менавіта цяпер. Тады чалавек адкрыецца з найлепшага боку. Дарэчы, я дагэтуль сутыкаюся з тым, што людзі не ведаюць, хто такі кансьерж. Часам пытаюцца: «Ты дзверы ў гатэлі адчыняеш?» Але пасля таго, як я ім расказваю аб сутнасці прафесіі, здзіўляюцца і пачынаюць ставіцца да яе з павагай.

— І ўсё ж — ёсць тое, што можа вывесці цябе з раўнавагі?

— Засмучаюць неарганізаванасць і безадказнасць. Напрыклад, госць прыходзіць з нейкай просьбай, і калі я выконваю вялікую частку работы, паведамляе мне аб тым, што перадумаў. Але чалавека таксама можна зразумець. Можа, у яго рэзка змяніліся планы?

— А што наконт знешняга выгляду? Могуць звольніць за татуіроўку або зялёны колер валасоў?

— Калі ёсць тату, іх трэба абавязкова хаваць пад адзеннем, на твары яны — табу. Яркія валасы, манікюр, макіяж таксама пад забаронай. Пірсінг падчас змены прыйдзецца здымаць. Усё павінна быць максімальна натуральна.

— У далейшым хацеў бы атрымаць вопыт работы ў гатэлях сусветнага ўзроўню?

— Кансьерж будзе на сваім месцы там, дзе вырас. Бо ён ведае, якія падзеі перажыла краіна, чым можна здзівіць гасцей — зможа расказаць аб усім. Таму ў найбліжэйшыя гады я планую засяродзіцца на рабоце ў сталічным гатэлі, тым больш што ён нічым не адрозніваецца ад замежных. Праўда, было б выдатна, калі б рух кансьержаў развіваўся ў нас больш актыўна. Напрыклад, у той жа Расіі ёсць прадстаўніцтва Міжнароднага саюза атэльных кансьержаў «Залатыя ключы» — закрытай прафесійнай супольнасці, якая аб'ядноўвае больш за чатыры тысячы работнікаў найлепшых гатэляў з больш чым 80 краін. Амаль кожны з нас хоча трапіць туды. На жаль, у Беларусі свайго прадстаўніцтва пакуль што няма.

«Кансьерж будзе на месцы там, дзе вырас. Бо ён ведае, якія падзеі перажыла краіна, чым можна здзівіць гасцей — зможа расказаць аб усім».

«Аднойчы для госця гатэля я адшукаў школьнае каханне. З адной дзяўчынай ён 30 гадоў таму разам вучыўся».

— Калі знаходзішся ў падарожжы, зазіраеш у гасцініцы, каб завесці новыя знаёмствы?

— О, гэта мой галоўны пункт у паездках! Радуе тое, што ўсе заўсёды ветлівыя, зацікаўленыя ў абмене вопытам. Але наогул, калі гаварыць пра хобі, то я вельмі люблю гатаваць, прысвячаю гэтаму шмат вольнага часу. І яшчэ мне падабаецца авіяцыя.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

Усё — у тваіх руках!

Як становяцца паэтамі,

або На што творцу можа натхніць... бульба

«Калі аўтар кажа, што піша толькі для сябе, — не верце. Творчаму чалавеку патрэбен глядач ці слухач», — сцвярджае паэтка Ганна Сабалевіч. Дзяўчына скончыла эканамічны факультэт БДУ, працуе маркетолагам, а ў вольны час... піша вершы пад псеўданімам SANN. Летась яна выпусціла аднайменны зборнік. Дзе ўзяць рашучасці, каб падзяліцца сваёй творчасцю? Як прыцягнуць аўдыторыю? А знайсці ўласны стыль? Пра ўсё гэта Ганна расказала «Чырвонцы. Чырвонай змене».

* * *



Першы «сур'ёзны» верш Ганна напісала ў школе і прысвяціла яго старшакласніку, у якога была закаханая. Сапраўдны паэтычны шлях дзяўчына пачала на другім курсе ўніверсітэта, калі паступова пачаў афармляцца яе індывідуальны стыль.

— Я перастала рыфмаваць дзеясловы. Мне нецікава чытаць вершы класічнага плана. У іх нельга дадумаць чагосьці свайго, — лічыць паэтка. — На мяне моцна паўплываў раман «Мы» Яўгена Замяціна. Хоць твор і напісаны ў прозе, многія фразы, знакі прыпынку чытач можа расшыфраваць так, як ён сам таго хоча. Падобнага эфекту я дабіваюся ў сваіх вершах.

Дзяўчына натхняецца творчасцю Уладзіміра Маякоўскага, Веры Палазковай, Яўгена Соя. Ганна не ўтойвае: некаторыя мастацкія прыёмы яна падгледзела ў любімых паэтаў. Аднак выкарыстоўвае іх ва ўласнай інтэрпрэтацыі.

— Напрыклад, ёсць выраз «as you wish» (ад англ. «як пажадаеш». — **Аўт.**), а ў рускай мове бясконцая колькасць дзеясловаў з канчаткам «ишь». Атрымліваецца небанальная рыфма, якую я вельмі люблю. З дапамогай англійскай мовы ўзнікае цікавая гульня слоў. Аднойчы мне ў галаву прыйшоў выраз «больш, чым more». Гэта пра маштабы — можна перавесці як «больш, чым больш». І адначасова прачытаць як «больш, чым мора», — тлумачыць Ганна.

Дзяўчына прызнаецца, што ў яе добра развіта асацыятыўнае мысленне і зрокавая памяць. Ёй пастаянна візуальна ўяўляюцца розныя словы і варыяцыі іх пастаноўкі. Паэтка нават стварае неалагізмы.

— Нядаўна прыдумала слова «суботнічаць». Гэта азначае — паводзіць сябе ў рабочы дзень так, быццам у цябе выхадны, — тлумачыць Ганна. — Я ўдзячная маме за тое, што ў дзяцінстве яна чытала мне шмат кніжак. Карані майго ўнутранага філолага ідуць адтуль.

* * *

З 2013 года свае вершы Ганна выкладвае ў групе ва «УКантакце». Доўгі час дзяўчына пра гэта нікому не расказвала. На «паблік» было падпісана ўсяго пяць чалавек, якіх паэтка нават не ведала.

— Вершы можна захоўваць рознымі спосабамі: у сшытку, у нататках на тэлефоне, ды хоць у выглядзе запісак на халадзільніку. Мне ж зручна было размяшчаць іх у сацыяльнай сетцы. Так я бачыла храналогію сваёй творчасці. Часта прагортвала «сцяну» групы і глядзела, як змяняецца мой стыль, настрой, — кажа суразмоўніца.

Пасля публікацыі зборніка колькасць удзельнікаў «пабліка» ўзрасла да сямісот чалавек. Паэтка актыўна спрабуе прыцягнуць аўдыторыю.

— Я адначасова і паэт, і SMM-спецыяліст, — жартуе Ганна. — Цяпер вершы ў групу выкладваю толькі ў пэўны час, суправаджаю іх прыгожымі малюнкамі. Рэкламую свой «паблік» праз іншыя старонкі ў сацыяльнай сетцы.

* * *

Галоўную прычыну, па якой Ганна вырашыла апублікаваць зборнік, яна тлумачыць так:

— Мастак можа памацаць сваю карціну, а вось паэту ў гэтым плане больш складана. Для мяне важна літаральна дакранацца да вершаў. Праводзіць рукамі па надрукаваных радках — асаблівае задавальненне.

Калі нарадзілася ідэя зборніка, у дзяўчыны было толькі 30 вершаў. Яна вырашыла: «Напішу 50 — займуся публікацыяй». Праз тры месяцы мэта была дасягнута. Ганна падзяліла ўсе свае вершы на тры групы.

— Першая частка зборніка — пра закаханасць, другая — пра любоўныя пакуты кахання, а трэцяя — філасофская. Усё як у жыцці: ты ўлюбляешся; калі пачуцці праходзяць, табе балюча; потым боль слабее, і ты паварочваешся тварам да сябе, разважаеш пра тое, хто ты ў гэтым свеце. Ёсць яшчэ чацвёртая частка, у якой усяго адзін верш. Ён даносіць думку, што, колькі б ты ні праводзіў часу са сваім асяроддзем, унутры ты ўсё роўна адзін, — кажа паэтка.

Ганна вызначыла паслядоўнасць вершаў, прыдумала загаловак для кожнай часткі, падабрала ілюстрацыі. Вокладку дзяўчына звярстала самастойна ў праграме Photoshop. Назва зборніка —«SANN» — зашыфраваныя імя і прозвішча паэткі. А побач з ім на вокладцы фраза-тлумачэнне — «чытаць як сонца».

І вось галоўны этап — званок у выдавецтва. Зрабіць яго дзяўчына доўга не адважвалася.

— Было страшнавата паказваць чужому чалавеку свае вершы. Але мне пашанцавала, калі я нарэшце знайшла прыдатнае выдавецтва, — расказвае Ганна.

Для прэзентацыі зборніка паэтка арандавала памяшканне. Мерапрыемства не рэкламавала — запрасіла толькі тых, з кім была гатова падзяліцца асабістым.

— Перад чытаннем хвалявалася. Нават не чакала, што прыйдзе шмат людзей. Але калі ўсе погляды былі скіраваныя на мяне, раптам адчула, што гатова дарыць усім сваю станоўчую энергетыку. Гэта неверагодна!

* * *

— Мы з мамай шмат разоў спрабавалі гатаваць бульбу ў духоўцы, але яна чамусьці не запякалася. Мы не разумелі, у чым справа, пакуль аднойчы нашы знаёмыя не параілі паставіць духоўку на іншы рэжым. Пасля гэтага выпадку я напісала верш, у якім гаворыцца, што нельга рабіць адно і тое ж і спадзявацца на іншы вынік. Так, як сапраўдны беларускі паэт, я натхнілася бульбай, — смяецца Ганна.

Калі казаць сур'ёзна, дзяўчыну больш за ўсё натхняюць людзі.

— Я пішу вершы пра свае ўзаемаадносіны з грамадствам. Гучыць банальна. Аднак на тое і існуюць тысячы аўтараў, каб кожнаму чытачу штосьці прыйшлося даспадобы, — сцвярджае паэтка. — Творчасцю я хачу паказаць, што быць сентыментальным — нармальна, любыя душэўныя перажыванні — гэта прыгожа.

Ганна ніколі не прымушала сябе пісаць. Адзінае — яна імкнецца не ўпускаць імпульс. Жаданне тварыць прыходзіць і ў дзве гадзіны ночы, і за рулём аўтамабіля, і пры размове з сяброўкай.

— Я «страціла» некалькі вершаў проста таму, што своечасова не запісала думку, — прызнаецца дзяўчына. — Стараюся ў меншую колькасць слоў змясціць як мага больш сэнсу, бо цяпер у людзей няма часу чытаць паэмы.

* * *

Ганна ўсур'ёз задумваецца аб стварэнні другога зборніка. Аднак пакуль матэрыялу для яго недастаткова. Найбліжэйшая мэта — сто вершаў.

— У мяне ёсць знаёмыя, якія таксама пішуць іх. Даведаўшыся пра мой вопыт, і яны плануюць апублікаваць зборнік. Гэта ідэя цяпер не здаецца нездзяйсняльнай. Тут няма нічога складанага, галоўнае — рашучасць і ўпэўненасць у тым, што твая творчасць будзе камусьці цікавая, — лічыць суразмоўніца. — Кажуць, паэзія памірае. Абсалютна не згодная. Яна відазмяняецца, эвалюцыянуе, але жыве. Зараз паэтам больш складана: усё ўжо створана да іх, застаецца толькі камбінаваць словы, гуляць з імі. Гэтым я і займаюся.

P.S. *Паэтка прызналася, што па-беларуску вершы ніколі не пісала. Аднак інтэрв'ю натхніла Ганну на эксперымент.*

З'явілася на маім
парозе,
ззяеш вачыма.
Ты падобна
да словаў лепшых
у вершах і прозе.

Ці гэта магчыма:
быць самай прыгожай
істотай у прыродзе?..

Дзе ты цяпер?
не ведаю нічога,
як той самы Джон Сноў.
Пазбаў мяне
ад асцярогі
не ўбачыць твае вочы
зноў.

Ганна КОСАР.

Паставім эксперымент

«Не вучы вучонага»

Пад такой назвай БДУ і Белтэлерадыёкампанія запусцілі сумесны праект. Ён арыентаваны на школьнікаў і мае на мэце папулярызацыю навукі сярод моладзі, а таксама дзейнасць маладых вучоных БДУ.

Як расказалі ў прэс-службе ВНУ, кожны выпуск прысвечаны адной з навуковых сфер, ахопліваючы гуманітарныя і прыродазнаўчыя дысцыпліны. Героі сюжэтаў — таленавітыя дзеці і маладыя вучоныя БДУ, якія спецыялізуюцца на канкрэтным прадмеце.

Падчас баталій героям трэба не толькі прадэманстраваць веды, але і паказаць кемлівасць і нестандартнасць рашэння прапанаванага задання. Пераможцу ў гэтым спаборніцтве вызначыць глядач шляхам адкрытага галасавання ў сацыяльнай сетцы «УКантакце» https://vk.com/pincode_b2

Унікальнасць праекта заключаецца ў аўтарскім складзе. Ініцыятыва, канцэпцыя і рэалізацыя праекта цалкам належаць студэнтам БДУ — трэцякурсніцам факультэта журналістыкі Ганне Гукіш і Дар'і Куксе. Кіраўніком праектнага маладзёжнага калектыву выступіла загадчыца кафедры тэлебачання і радыёвяшчання Алеся Кузьмінава.

Тэматычная рубрыка выходзіць штотыдзень на тэлеканале «Беларусь 2» па серадах у 15.45 у рамках інтэрактыўнай маладзёжнай праграмы «Пін_код».

Сяргей РАСОЛЬКА.

Класныя навіны

Як трапіць у дзіцячы тэхнапарк?

Даследчы праект, тэст і гутарка

Міністэрства адукацыі вызначыла парадак адбору навучэнцаў у Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк для засваення праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі. Адпаведная пастанова размешчана на сайце Нацыянальнага прававога інтэрнэт-партала.

Адбор будзе весціся, як правіла, з ліку навучэнцаў 9—11-х класаў устаноў, якія рэалізуюць праграмы агульнай сярэдняй адукацыі і спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй. Тэрміны яго правядзення вызначаюцца дзіцячым тэхнапаркам і размяшчаюцца на сайце ўстановы не пазней чым за 20 каляндарных дзён да пачатку.

Адбор будзе праводзіцца экспертным саветам дзіцячага тэхнапарка ў тры этапы. Для ўдзелу ў першым з іх навучэнец накіроўвае на сайт дзіцячага тэхнапарка праект (работу) даследчага характару ў выглядзе файла ў фармаце PDF. Праекты, якія набралі найбольшую колькасць балаў, дапускаюцца да наступнага этапу. Да ўдзелу ў другім этапе без праходжання першага дапускаюцца таксама пераможцы, прызёры міжнародных і рэспубліканскіх адукацыйных мерапрыемстваў, удзельнікі заключнага этапу рэспубліканскіх адукацыйных мерапрыемстваў, пераможцы або прызёры абласных (мінскага гарадскога) этапаў такіх мерапрыемстваў. Падчас другога адборачнага этапу навучэнцы выконваюць тэставыя заданні на вызначэнне ўзроўню іх тэхнічнага, аналітычнага і прасторавага мыслення. На трэцім этапе прадугледжана субяседаванне, па выніках якога фарміруюцца групы для навучання па пэўных кірунках.

Школьнікі, якія набралі найбольшую суму балаў па выніках другога этапу, маюць першачарговае права на залічэнне для навучання па кірунку, названым імі пры падачы заяўкі. Астатнім навучэнцам можа быць дадзена магчымасць навучання па іншых кірунках пры наяўнасці вакантных месцаў.

Таксама пастановай Міністэрства адукацыі быў зацверджаны парадак рэалізацыі ў Нацыянальным дзіцячым тэхнапарку адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі адораных дзяцей і моладзі. Яна скіравана на выяўленне і развіццё ў вучняў здольнасцяў да навукова-даследчай і вынаходніцкай дзейнасці, разлічана на вочную і завочную формы атрымання адукацыі. Пры гэтым адукацыйны працэс у вочнай (дзённай) форме атрымання адукацыі арганізуецца ў дзіцячым тэхнапарку па зменах у навучальных групах па 7—10 чалавек або індывідуальна. У завочнай (дыстанцыйнай) форме — толькі індывідуальна. Тэрмін атрымання дадатковай адукацыі ў вочнай форме складае ад 21 да 24 каляндарных дзён, у завочнай — 3 месяцы.

Пасля засваення навучэнцам зместу адукацыйнай праграмы дзённай формы ён на падставе заявы законных прадстаўнікоў можа быць залічаны на дыстанцыйную форму атрымання адукацыі.

Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк — гэта якасна новая ўстанова адукацыі, скіраваная на выхаванне нацыянальнай інтэлектуальнай эліты. Як мяркуецца, штогод у ім будзе вучыцца каля дзвюх тысяч найбольш адораных дзяцей. Галоўныя кірункі — робататэхніка, 3D-мадэляванне, інтэрнэт-праекты, інфармацыйныя тэхналогіі — усяго каля 10. Плануецца, што парк пачне працаваць у сталіцы да 1 студзеня 2021 года.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ И ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. 8 (0212) 24-63-14, 8 (029) 510-07-63.
Продавец: открытое акционерное общество «Завод «ЭВИСТОР», 210101, г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81, тел.: 8 (0212) 55-11-81, 8 (044) 5941732.
Повторный аукцион 04.12.2019 в 14.30

Лот № 1. Изолированное помещение с инв. № 200/D-122150, площадь – 403,7 кв. м, назначение – производственное помещение, наименование – производственное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/20-4. **Нач. цена**: 8 386,81 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 838,68 бел. руб.
Лот № 2. Изолированное помещение с инв. № 200/D-163118, площадь – 303,5 кв. м, наименование – бытовые помещения, назначение – помещение неустановленного назначения, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-11а. **Нач. цена**: 12 918,00 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 1 291,80 бел. руб.
Лот № 3. Изолированное помещение с инв. № 200/D-163116, площадь – 584,6 кв. м, наименование – административное помещение, назначение – административное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-11б. **Нач. цена**: 26 971,72 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 2 697,17 бел. руб.
Лот № 4. Изолированное помещение с инв. № 200/D-163119, площадь – 555,1 кв. м, наименование – бытовые помещения, назначение – помещение неустановленного назначения, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-11. Нач. цена: 20 699,17 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 2 069,91 бел. руб.
Лот № 5. Изолированное помещение с инв. № 200/D-123350, площадь – 161,8 кв. м, наименование – административное помещение, назначение – административное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-14. Нач. цена: 5 293,84 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 529,38 бел. руб.
Лот № 6. Изолированное помещение с инв. № 200/D-163107, площадь – 330,4 кв. м, наименование – административное помещение, назначение – административное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-16. **Нач. цена**: 13 510,24 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 1 351,02 бел. руб.
Лот № 7. Изолированное помещение с инв. № 200/D-163111, площадь – 265,5 кв. м, наименование – административное помещение, назначение – административное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-16в. **Нач. цена**: 10 862,07 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 1 086,20 бел. руб.
Лот № 8. Изолированное помещение с инв. № 200/D-163108, площадь – 37,7 кв. м, наименование – административное помещение, назначение – административное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-16а. **Нач. цена**: 1 535,98 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 153,59 бел. руб.
Лот № 9. Изолированное помещение с инв. № 200/D-163109, площадь – 142,3 кв. м, наименование – административное помещение, назначение – административное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/19-16б. **Нач. цена**: 5 818,09 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 581,80 бел. руб.
Лот № 10. Изолированное помещение с инв. № 200/D-184038, площадь – 556,7 кв. м, наименование – производственное помещение, назначение – производственное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/20-19. **Нач. цена**: 16 807,23 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 1 680,72 бел. руб.
Лот № 11. Изолированное помещение с инв. № 200/D-186394, площадь – 409,7 кв. м, назначение – складское помещение, наименование – склад, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/4-1. Обременение: договор аренды сроком до 17.01.2024. **Нач. цена:** 48 450,00 бел. руб. без учета НДС. **Задаток:** 4 845,00 бел. руб.
Лот № 12. Капитальное строение с инв. № 200/С-86464, объем – 288 куб. м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, резервуар вблизи здания № 81/30, наименование – резервуар, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения. **Нач. цена**: 26 083,45 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 2 608,34 бел. руб.
Лот № 13. Изолированное помещение с инв. № 200/D-172940, площадь – 595,5 кв. м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/20-5а, наименование – производственное помещение, назначение – производственное помещение. **Нач. цена**: 37 627,08 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 3 762,70 бел. руб.
Лот № 14. Изолированное помещение с инв. № 200/D-184032, площадь – 134,4 кв. м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/20-13, наименование – гараж, назначение – помещение транспортного назначения. Обременение: договор аренды № 13 от 01.09.2018 сроком по 31.08.2023. **Нач. цена**: 22 514,12 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 2 251,41 бел. руб.
Лот № 15. Изолированное помещение с инв. № 200/D-181327, площадь – 76 кв. м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/48-2, наименование – нежилое помещение, назначение – помещение неустановленного назначения. Обременение: договор аренды № 5 от 01.06.2019 сроком по 31.05.2029. **Нач. цена**: 11 919,86 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 1 191,98 бел. руб.

Дата, время и место проведения повторного аукциона: 04.12.2019 в 14.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 31.10.2019 с 08.30 по 03.12.2019 до 17.30. Имущество расположено на зем. участке с кадастровым № 240100000001002628. Ранее опубликованные извещения: газета «Звязда» 09.04.2019 г., 27.04.2019 г., 15.06.2019 г., 24.08.2019 г., 29.08.2019 г., 19.09.2019 г., 03.10.2019 г., газета «Республика» 27.08.2019 г.

Первый аукцион: 04.12.2019 в 15.00

Лот № 1. Изолированное помещение с инв. № 200/D-187631, площадь – 1091,8 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81-37, наименование – производственное помещение, назначение – производственное помещение. Изолированное помещение с инв. № 200/D-187156, площадь – 399,8 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81-10, наименование – производственное помещение, назначение – производственное помещение. Имущество расположено на зем. участке с кадастровым № 240100000001002833. **Нач. цена**: 181 393,59 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 18 139,35 бел. руб.
«А вось зараз пра пераезд у Мінск! Гэту гісторыю ведаюць ужо вельмі многія, яна сапраўды перавярнула ўсё маё жыццё. Быў якраз той жыццёвы перыяд, калі настаў час вызначацца з паступленнем і наогул з усім сваім будучым. Шчыра, я не ведала куды падацца: у школе была далёка не выдатніцай. Разумела, што хутчэй за ўсё паступлю ў якую-небудзь прафесійна-тэхнічную ўстанову ды і тое, мабыць, ледзь-ледзь. І якраз у гэты вырашальны момант мяне знайшла Аня, мой менеджар. Яна напісала СМС з паведамленнем: «Універсітэт культуры, Мінск. Я табе дапамагу!» Спачатку нават не ведала, як на гэта ўсё рэагаваць, але ўсё ж рашылася. Падумала, што, магчыма, гэта лёс! У выніку прыехала на дзень адкрытых дзвярэй, Аня аплаціла падрыхтоўчыя курсы, я пажыла ў яе тыдзень і здала ўсе экзамены на выдатна. І вось у верасні ўжо была студэнткай Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў на кафедры рэжысуры.

Вядома, бацькі хваляваліся, але ў той жа час і радаваліся, што ў мяне атрымалася паступіць ва ўніверсітэт. Былі такія моманты, калі хто-небудзь з далёкіх сваякоў, цёткі-дзядзькі, казалі маім бацькам: «Як вы можаце яе адпускаць незразумела з кім» і г. д. Тады ў іх зноў узнікалі сумненні, але вера ў мяне і здаровы сэнс перамаглі. Сябры былі таксама за мяне рады, а вось некаторыя аднакласнікі зайздросцілі, яны думалі «чаму гэта ёй усё на халяву» і «чым яна гэта заслужыла».

ЮТУБ, КОРЖ І МАНАЦІК

«Калі ўпершыню прыехала ў Мінск, ён здаваўся мне найвелізарнейшым і па-вар'яцку прыгожым горадам. Я не разумела, чаму тут так шмат усяго: крамаў, розных кавярняў. Усяго! Нават цяпер, калі пражыла ў Мінску ўжо пару гадоў і пабывала ў розных гарадах не толькі Беларусі, але і за яе межамі, ён застаецца адным з маіх любімых.

Пасля пераезду я не закінула вядзенне канала на YouTube, а, наадварот, пачала развіваць сябе і сваю творчасць яшчэ больш. Наогул, усё пачыналася з размяшчэння відэаролікаў ва «УКантакце». Быў нават такі выпадак, калі Макс Корж рэпоснуў мой ролік да сябе на старонку. Гэта было вельмі крута! А прыкладна ў 2012 годзе я «перасялілася» на YouTube. Тады ён набіраў найбольшую папулярнасць. У школе ўсе толькі і казалі пра вядомых блогераў. І я падумала: а чаму б і не? Бо я магу там спяваць!

Яшчэ адным найбольш яркім момантам майго творчага жыцця з'яўляецца знаёмства з Манацікам. Гэта гісторыя пачалася з таго, што Аня з'ехала ў іншую краіну, пакінуўшы мяне адну ў Мінску. Я засумавала і мне захацелася адправіць ёй музычнае прывітанне. Ані ў той час вельмі падабалася творчасць Манаціка, а я з ім толькі знаёмілася. Выбрала яго песню «Паветра» і зрабіла на яе кавер. Пасля ён зарэпосціў гэта відэа да сябе. Тады яшчэ было пацешна, што ў мяне на гэтую песню больш рэпостаў, чым у яго *(смяецца)*. Праз нейкі час Аня рабіла карпаратыў для сваёй кампаніі, куды Манацік быў запрошаны выступаць. Я там спявала на разагрэве і пасля зняла гісторыю для сацыяльных сетак, што знаходжуся на гэтым мерапрыемстве. Ён убачыў яе і запрасіў мяне да сябе ў грымёрку, хваліў і жадаў удачы».

«ЗАЛЕГЧЫ», КАБ ГАСТРАЛЯВАЦЬ

«Ведаеце, часта пытаюцца, кім мне больш падабаецца быць: блогерам або спявачкай? Цяпер амаль усе, хто не знайшоў сябе, хочуць стаць блогерамі, ну, не лічачы, мабыць, зусім маленькіх дзяцей. Таму што гэта цяпер папулярна, як раней — станавіцца ўрачамі або настаўнікамі. Да таго ж многія чамусьці думаюць, што быць блогерам, азначае без усялякіх намаганняў атрымліваць добры заробак. Аднак я хачу быць спявачкай! Гэта ж і было маёй першапачатковай мэтай. І ўвогуле, калі б я была толькі блогерам, то з мяне б ён выйшаў вельмі лянівы *(смяецца)*.

У мяне вельмі шмат планаў на будучыню. Я збіраюся пачаць запісваць яшчэ больш песень, нарошчваць сваю аўдыторыю. Гэтыя два гады мы старанна гастралявалі па розных гарадах, нават цяпер знаходзімся на гастролях. Таму на год «заляжам», набяромся новых сіл і натхнення, а потым будзем гастраляваць яшчэ больш».

Ангеліна НОВІКАВА,
студэнтка III курса
Беларускага дзяржаўнага
ўніверсітэта культуры
і мастацтваў.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 30.10.2019 г.

Мы разам — Беларусь!

Краіна моцная рэгіёнамі: Віцебск

Горад, усё больш прывабны для турыстаў



ВІЦЕБСК нядаўна адсвяткаваў 1045-годдзе. У абласным цэнтры з кожным годам усё больш турыстаў, якім паказваюць горад 65 прафесійных экскурсаводаў і тры гіды-перакладчыкі, у тым ліку з кітайскай мовы. Прывабнасць Віцебска з пункту гледжання развіцця турызму пацвярджае той факт, што экскурсійныя туры арганізоўваюць фірмы з іншых гарадоў краіны і блізкага замежжа.

А НА ЛІХТАРАХ — ЧАЛАВЕЧАК

У горадзе над Заходняй Дзвіной, канешне, абавязкова трэба ўбачыць усё, што нагадвае пра самага славутага віцябляніна. Марк Шагал праславіў горад, дзе нарадзіўся, на ўвесь свет. Дарэчы, адзін з экскурсійных маршрутаў мае назву «Віцебск — горад Марка Шагала».

У абласным цэнтры найбольшае развіццё атрымаў культурна-пазнавальны турызм. Рэсурсам для яго развіцця з'яўляюцца 107 гісторыка-культурных каштоўнасцяў, сем аб'ектаў археалагічнай спадчыны, пяць музейных устаноў з філіяламі.

Як паведаміў **намеснік старшыні Віцебскага гарвыканкама Віктар ГЛУШЫН,** з мэтай далейшага развіцця турызму ў горадзе праводзіцца работа па добраўпарадкаванні і развіцці турыстычнай інфраструктуры. За апошнія некалькі гадоў з'явіліся новыя скульптуры: «Стары Хатабыч», «Залатая Рыбка», «Віцебскі волат» (самаму высокаму чалавеку ў свеце Фёдару Махнову), «Лучоса», помнік дэсантніку...

Каля ратушы, якая з'яўляецца сімвалам горада, на вуліцы Крылова можна адпачыць на ўнікальнай арт-лаве «Сядзейка». Рэалізаваны арт-праект «Дзядзька Віця» (размяшчэнне на ліхтарах выявы чалавечка).

Летась у дарэвалюцыйным асабняку на вуліцы Марка Шагала ўрачыста адкрыўся музей гісторыі Віцебскага народнага мастацкага вучылішча.

Ажыццяўляецца работа над новымі праектамі: «Над горадам» (калі скрыпачка выступае на балконе ратушы) і «Васільковы гід» (па ўсталяванні інфармацыйных знакаў з QR-кодамі).

Сёлета распрацаваны і тыражаваны новыя карты, якія спалучаюць у сабе і даведнік па горадзе. Плануецца размяшчэнне гэтых карт з магчымасцю запампоўкі на афіцыйным сайце Віцебскага гарадскога выканаўчага камітэта ў раздзеле «Віцебск турыстычны».

У горадзе функцыянуе больш за 50 прадпрыемстваў туріндустрыі, якія прапануюць праграмы як унутранага, так і міжнароднага турызму.

ПРЫЯЗДЖАЮЦЬ ПА ПАДЗЕІ

Штогод экскурсаводамі, турыстычнымі прадпрыемствамі, музеямі, студэнтамі ВДУ імя П. М. Машэрава распрацоўваюцца аўтарскія экскурсіі.

Значнае развіццё ў Віцебску атрымаў падзейны фестывальны турызм. Сярод найбольш значных міжнародных культурных форумаў — «Славянскі базар у Віцебску», фестываль імя І. І. Салярцінскага, сучаснай харэаграфіі IFMC. Вельмі папулярны таксама міжнародны турнір па спартыўных бальных танцах «Віцебская Сняжынка» і іншыя культурныя і спартыўныя падзеі.

Адна з віцебскіх турыстычных фірмаў сумесна з супрацоўнікамі музея-сядзібы мастака Ільі Рэпіна «Здраўнёва», гарадскім цэнтрам дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, а таксама каледжам культуры і мастацтва праводзіць вялікую работу па прыцягненні дзяцей і моладзі з розных краін на фестываль дзіцячай і маладзёжнай творчасці «Вясёлка над Віцебскам». Падчас яго арганізуюцца выстаўкі-конкурсы, майстар-класы, пленэры. Толькі сёлета ў гэтым фестывалі ўдзельнічала больш за 1100 чалавек з Беларусі, Расіі, Латвіі, Літвы і іншых краін.

Для размяшчэння турыстаў у горадзе працуюць 11 гасцініц, у тым ліку два буйныя турысцка-гасцінічныя комплексы, і столькі ж хостэлаў. Пазалетась у гістарычным цэнтры адкрыўся новы гатэль.

Работнікі турыстычных кампаній і гасцініц бяруць актыўны ўдзел у турыстычных выстаўках і семінарах. У красавіку мінулага года быў арганізаваны рэкламны тур для прадстаўнікоў вядучых польскіх тураператараў.

Дарэчы, на працягу апошніх гадоў у Віцебску назіраецца станоўчая дынаміка экспарту турыстычных паслуг. У прыватнасці, у студзені — маі ён перавысіў 1,1 мільёна долараў ЗША з тэмпам росту 104,6 % да ўзроўню аналагічнага перыяду мінулага года.

ШМАТ ІНВЕСТУЕЦЦА Ў КУЛЬТУРУ

У Віцебску нямала грошай укладваецца ў развіццё культуры. На высокім арганізацыйным і мастацкім узроўні штогод праводзіцца каля 2000 мерапрыемстваў. Самай значнай культурнай падзеяй года па-ранейшаму застаецца Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Сёлета ён прайшоў 28-ы раз і сабраў прадстаўнікоў 42 краін свету і больш за 5000 удзельнікаў. У рамках фестывалю адбылося больш за 20 спадарожных мерапрыемстваў.

Пэўная ўвага была ўдзелена ўдасканаленню і ўмацаванню матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў культуры. У адпаведнасці з інвестыцыйнай праграмай летась завершаны работы па рэканструкцыі будынка «Музей гісторыі Віцебскага народнага мастацкага вучылішча». Таксама былі выкананы работы па рэканструкцыі будынка па вуліцы Сярэдненабярэжнай, 7, які з'яўляецца помнікам архітэктуры канца XIX — пачатку XX стагоддзя. У ім адкрыты аддзел загс адміністрацыі Чыгуначнага раёна. Акрамя таго, былі завершаны работы па рэканструкцыі тэніснага кортаў і ніжняга ўзроўню культурна-спартыўнага комплексу летняга амфітэатра, дзе ўжо абсталяваны гарадок экстрэмальных відаў спорту.

У рамках рэалізацыі міжнароднага праекта пры падтрымцы Еўрапейскага саюза ствараецца інтэрактыўны цэнтр так званай жывой гісторыі «Варгентон». У ліку іншага там можна будзе наведаць рамесныя майстэрні.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«ВІЦЯЗЬ» ЗАЎСЁДЫ Ў НАГУ З ЧАСАМ!

«Прастата выкарыстання нашай прадукцыі дорыць вам пачуццё гармоніі!» — дэвіз аднаго з флагманаў беларускай прамысловасці — ААТ «Віцязь»

Гісторыя існавання «Віцязя» пачалася ў сакавіку 1976 года. Тады было прынята рашэнне аб стварэнні тэлевізійнага завода. Праз год з канвеера сышоў першы каляровы тэлевізар другога пакалення «Віцязь-722».

У 1979-м тэлевізарам «Віцязь-722» прысвоены Знак якасці. У 1988-м з канвеера сышоў мільённы тэлевізар. У 1990-м прадпрыемства прыступіла да выпуску медтэхнікі. А ў 1991-м створаны выпрабавальны сертыфікацыйны цэнтр.

У 2001 годзе адбыўся візіт Прэзідэнта на прадпрыемства. Гадавы выпуск тэлевізараў перавысіў 300 тысяч.

ЗАЎСЁДЫ Ў ТРЭНДЗЕ

Вельмі багаты быў на падзеі 2009 год. Тады лінейку LCD-тэлевізараў папоўнілі мадэлі premium-класа ў корпусе з натуральнага дрэва і з палепшаным акустычным суправаджэннем. Быў распачаты выпуск лінейкі лічбавых цюнераў «Віцязь».

І ЗАРАДКІ ДЛЯ АЎТАМАБІЛЯЎ

Падчас экскурсіі на «Віцязь» вельмі цікава было ўбачыць электразарадныя станцыі для аўтамабіляў. Ёсць сярод іх прылады для хуткай зарадкі і тыя, якія напаўняюць энергіяй за трэць сутак. Такія ўстаноўкі можна ўбачыць на тэрыторыі аўтазаправачных станцый «Беларуснафты» — нацыянальнага аператара па развіцці электрычнага транспарту. А яшчэ яны эксплуатуюцца ў Расіі.

Ёсць у вытворцы і зарадка для індывідуальнага карыстання. Такую можна павесіць у гаражы або на фасадзе катэджа.

«Віцязь» — удзельнік рэалізацыі інавацыйнай нацыянальнай праграмы па замене аўтамабіляў на «колы», якім не патрэбны бензін.

РОВАР МАРЫ

На прадпрыемстве вырабляюць і электрычныя ровары. На такім пасля зарадкі можна праехаць да 50 кіламетраў з максімальнай хуткасцю каля 25 кіламетраў у гадзіну. Двухколавы транспарт прызначаны пераважна для эксплуатацыі ў гарадскіх умовах, але дастаткова ўпэўнена сябе адчувае на любым цвёрдым дарожным пакрыцці па-за межамі горада, запэўніваюць на прадпрыемстве. На электраровары можна перамяшчацца як у звычайным рэжыме за кошт намаганняў чалавека, так і дзякуючы ўбудаванай сістэме асісціравання педалям PAS (Pedal Assist System) — у гібрыдным рэжыме. У апошнім вялікую частку нагрузкі з веласіпедыста здымае матор-кола.

Зручнасцю пры эксплуатацыі VITYAS Dark Horse з'яўляецца незалежнасць падсілкоўвання ліхтароў — лёгказдымнага пярэдняга і задняга. Гэта дазваляе ажыццяўляць рух з уключанымі ліхтарамі пры адсутнасці акумулятара. У гэтай мадэлі выкарыстоўваецца здымны акумулятар, размешчаны ў адмысловым футарале пад багажнікам. Колы лёгка складваюцца, і не будзе праблем занесці ровар у кватэру.

ДЛЯ МЕДЫЦЫНЫ І...

Вельмі перспектыўным на «Віцязі» лічаць нішу вырабаў медыцынскага прызначэння.

Рэцыркулятары паветра «Віцязь» з'яўляюцца апрамяняльнікамі закрытага тыпу з безазонавымі бактэрыцыднымі лямпамі і прызначаны для абеззаражвання паветра памяшканняў нават у прысутнасці людзей.

Яшчэ адзін прадукт — стэрылізатары, прызначаныя для апрацоўкі насычанай вадзяной парай пад ціскам у аўтаматычным рэжыме вырабаў з тэкстылю, хірургічных інструментаў, посуду і іншых вырабаў медыцынскага прызначэння.

А сухапаветраны тэрмастат прызначаны для стварэння і падтрымання ўнутры рабочай камеры стабільнай тэмпературы, неабходнай для правядзення бактэрыялагічных, сералагічных, імуналагічных і іншых даследаванняў. Тэрмастат можа прымяняцца для інактывацыі сываратак пры пастаноўцы сералагічных рэакцый.

На «Віцязі» вырабляюць апарат квантавай тэрапіі, які бязбольна лечыць шырокі спектр захворванняў, уздзейнічаючы магнітнымі і электрамагнітнымі палямі на кропкі акупунктуры, тканкі і клеткі арганізма.

Прылада дадаткова ўкамплектавана наборам святлаводаў з палімера, якія дазваляюць узмацніць і аптымізаваць лячэбнае ўздзеянне на арганізм.

Цікавы факт: аказваецца, «Віцязь» — вытворца спецыяльных «паддонаў», якія выкарыстоўваюцца для вырабу сыроў! Іх купляе іспанская кампанія, якая спецыялізуецца на пастаўцы абсталявання заводам у розных краінах Еўрапейскага саюза.

Вельмі перспектыўны ў гэтым кірунку, канешне, і рынак ЕАЭС.

«Віцязь» — пастаянны ўдзельнік выставак. Сярод іншага «Віцязь» — лаўрэат конкурсу «Найлепшыя тавары Рэспублікі Беларусь».

Рэалізацыя прадукцыі ў Беларусі ажыццяўляецца праз сетку ўласных крамаў, а таксама пры дапамозе інтэрнэт-крамы https://multimarket.by/

СТРАТЭГІЯ РАЗВІЦЦЯ

Наконт перспектыў: ААТ «Віцязь» мае велізарны досвед, тэхнічныя і інтэлектуальныя магчымасці, шматгадовую гісторыю вытворчай і навуковай дзейнасці ў розных сегментах рынку, і гэта з'яўляецца асновай далейшага развіцця прадпрыемства.

Прадукцыя, планаваная да выпуску групай кампаній ААТ «Віцязь» для масавага спажывання, арыентавана на спажыўцоў з сярэднім і вышэй сярэдняга ўзроўнямі даходу, для розных узроставых катэгорый. Прадукцыя вытворча-тэхнічнага прызначэння па ўзроўні цаны/якасці, спажывецкіх уласцівасцяў павінна адпавядаць найлепшым сусветным узорам. І ўжо сёння гэтага дасягнулі.

***P. S.** Для кантактаў з прадпрыемствам: нумар тэлефона +375 (212) 57-16-67, omis@vityas.com*

УНП 300031652

Будаўніцтва з гарантыяй якасці

Віцебскі домабудаўнічы камбінат — адзін з флагманаў будаўнічай галіны на постсавецкай прасторы

Якасць — традыцыя!

Віцебскі ДБК — камунальнае дзяржаўнае прадпрыемства камітэта па архітэктуры і будаўніцтве аблвыканкама. Прадпрыемства стала пераможцам XV юбілейнага рэспубліканскага конкурсу «Найлепшы будаўнічы прадукт года — 2018». У гэтым прэстыжным прафесійным спаборніцтве званне найлепшага яно атрымлівала таксама ў 2014, 2015 і 2016 гадах.

Гісторыя ж прадпрыемства пачалася ў 1966 годзе. Віцебскі ДБК — найбуйнейшая арганізацыя ў Віцебскай вобласці, якая будуе буйнапанэльныя дамы.

Здаюць «пад ключ»

Прадпрыемства шматпрофільнае. У яго структуры шэраг спецыялізаваных падраздзяленняў, якія ажыццяўляюць праектаванне і розныя віды будаўніча-мантажных работ. Гэта забяспечвае магчымасць будаваць розныя аб'екты «пад ключ».

На працягу 2008—2010 гадоў прадпрыемства правяло тэхнічнае пераўзбраенне завода БПД. У рамках праведзенага тэхнічнага пераўзбраення ўсё зношанае і састарэлае абсталяванне заменена на новае, у тым ліку кампаній Olmet Italy s.r.l. (Італія), Weiler Italia s.r.l. (Італія), MEP — Macchine Elettroniche Piegatrici s.p.a (Італія), BFS (Германія). Праведзена замена абсталявання арматурнага цэха, лініі вытворчасці элементаў інжынерных сетак, лініі вытворчасці пліт перакрыццяў пустотнага насцілу, ліній па вытворчасці вонкавых і ўнутраных сценавых панэляў, лініі вытворчасці аб'ёмных элементаў, усталяваны новы раствора-бетонны вузел. Асвоены сучасныя тэхналогіі, якія дазволілі выйсці на новы ўзровень прадукцыі, павысіўшы яе прывабнасць і канкурэнтаздольнасць.

Унікальныя дамы

Вытворчыя магутнасці завода буйнапанэльнага домабудаўніцтва дазваляюць выпусціць каля 180 тысяч кубічных метраў жалезабетонных і бетонных вырабаў.

Палепшылася энергаэфектыўнасць вонкавых панэляў, паддашкавых перакрыццяў, стала шырэйшай лесвічная клетка. Вырашана праблема безбар'ернага асяроддзя: у ліфт можна трапіць адразу пры ўваходзе ў пад'езд, а не толькі з першага паверха будынка, як раней.

Вонкавыя сцены маюць трохслаёвую канструкцыю («сандвіч»), што значна павышае трываласць, а таксама тэрмічнае супраціўленне.

Віцебскі ДБК — адзіны ў Беларусі вытворца дамоў серыі 111-108. І прадпрыемству ўдалося рэалізаваць прынцыпы энергаэфектыўнасці вытворчасці. Мадэрнізаваныя секцыі жылых дамоў буйнапанэльнага домабудавання (далей БПД. — **Аўт.**) серыі 111-108 выкананы з улікам усіх дзеючых патрабаванняў і тэхнічных магчымасцяў уласнага завода.

Серыя 111-108 мае вялікія магчымасці ў свабоднай планіроўцы кватэр, з'яўляецца адзінай у нашай краіне серыяй буйнапанэльных дамоў з падоўжанымі апорнымі сценамі. Яна дазваляе ажыццявіць любую кампаноўку лесвічнай пляцоўкі: можна скласці яе з адных 1-пакаёвых кватэр, 2-х, 3-пакаёвых або разнатыпных.

Сістэма якасці канчатковай будаўнічай прадукцыі на прадпрыемстве пацверджана сертыфікатам адпаведнасці патрабаванням — СТБ ISO 9001-2009.

На прадпрыемстве атрыманы сертыфікаты адпаведнасці ўсіх відаў работ, якія выконваюцца, патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў ТР2009 / 013 / BY. Прадукцыя выпускаецца згодна з патрабаваннямі тэхнічных нарматыўных прававых актаў.

Павысілі канкурэнтаздольнасць

У 2016 годзе праведзены работы па падаўжэнні дзеяння атэстатаў акрэдытацыі лабараторыі неразбуральнага кантролю, выпрабавальнай лабараторыі, а таксама лабараторыі электрафізічных вымярэнняў.

Тады ж былі ажыццёўлены работы па аглядзе зварачнай вытворчасці на адпаведнасць патрабаванням СТБ 2349-2013. Атрымана пасведчанне аб ацэнцы зварачнай вытворчасці.

Дарэчы, у той жа год быў атрыманы спецыяльны дазвол МНС на работы і паслугі, якія складаюць дзейнасць па забеспячэнні пажарнай бяспекі.

Палітыка прадпрыемства ажыццяўляецца пад дэвізам: «Задаволенасць заказчыка якасцю выкананых будаўніча-мантажных работ — найвышэйшая ацэнка дзейнасці калектыву». Асноўныя задачы ў галіне якасці: павышэнне якасці будаўніча-мантажных і праектных работ, якія выконваюцца, канкурэнтаздольнасць прадпрыемства на базе пастаяннага тэхнічнага пераўзбраення, укаранення новых працэсаў, матэрыялаў і тэхналогій; забеспячэнне выканання работ кваліфікаваным персаналам; забеспячэнне зніжэння долі выдаткаў на энергаспажыванне ў аб'ёме выкананых работ.

І таўнхаусы ў перспектыве

Развіццё панэльнага домабудавання ідзе ў нагу з часам. Для разнастайнасці архітэктурнага аблічча гарадоў распрацаваны праект 16-павярховага жылога дома. Канструктыўная схема дамоў серыі БПД 111-108 дазволіць захаваць у вышынных варыянтах жылых дамоў свабодную перапланіроўку кватэр.

Таксама ўкаранёная мадэрнізаваная 10-павярховая блок-секцыя з наборам кватэр 1-1-1-1-1-1-1.

Распрацоўваецца аднаслаёвая вонкавая сценная панэль, больш тэхналагічная і простая ў вытворчасці. Адным з перспектыўных кірункаў у праектаванні і будаўніцтве з'яўляецца развіццё малапавярховай забудовы тэрыторый у выглядзе аднакватэрных дамоў і таўнхаусаў.

Матэрыялы падрыхтаваў Аляксандр ПУКШАНСКІ.

УНП 300082594

Студэнтам хочацца вучыцца, а выпускнікам — вяртацца

Віцебскі дзяржаўны ордэна Дружбы народаў медыцынскі ўніверсітэт святкуе 85-гадовы юбілей. Віншуем!

Галоўная традыцыя ўніверсітэта — быць альма-матар для таленавітых людзей, геніяльных навукоўцаў і сапраўдных прафесіяналаў з вялікай літары, майстроў сваёй справы.

Адна з найбуйнейшых ВНУ

І будзе вельмі правільна канстатаваць, што Віцебскі медыцынскі ўніверсітэт — адзін з брэндаў не толькі горада, але і краіны.

Слаўная гісторыя ВНУ пачыналася 1 лістапада 1934 года. Тады ў Віцебску адкрылі бальніцу — медыцынскі інстытут. Там вучылася прыкладна 250 чалавек. У 1938 годзе ўстанова была перайменавана ў Віцебскі медыцынскі інстытут.

Цяпер універсітэт можна параўнаць з горадам у горадзе. Навучанне вядзецца ў некалькіх карпусах. На сямі факультэтах ВНУ атрымлівае веды каля сямі тысяч студэнтаў і слухачоў! Дарэчы, Віцебскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт — адна з найбуйнейшых вышэйшых медыцынскіх навучальных устаноў у Беларусі.

Асноўная задача ўніверсітэта — падрыхтоўка высокакваліфікаваных урачоў, стаматолагаў і правізараў з глыбокімі тэарэтычнымі ведамі і неабходнымі практычнымі навыкамі, якія валодаюць найноўшымі дасягненнямі айчыннай і замежнай навукі і тэхнікі.

У навучальнай установе ўдзяляецца асаблівая ўвага ўкараненню самых сучасных тэхналогій, паляпшэнню інфармацыйнага забеспячэння навучальнага працэсу, развіццю паслядыпломных формаў медыцынскай адукацыі і пашырэнню кантактаў паміж спецыялістамі і ўніверсітэтамі іншых краін, умацаванню матэрыяльна-тэхнічнай базы, навукова-даследчай рабоце.

Віцебскі дзяржаўны ордэна Дружбы народаў медыцынскі ўніверсітэт уносіць свой важкі ўклад у развіццё і ўдасканаленне сістэмы аховы здароўя нашай краіны.

На сёння ва ўніверсітэце працуюць 60 дактароў навук і 247 кандыдатаў навук. 45 % выкладчыкаў маюць вучоныя званні і ступені.

Асновай медыцынскай адукацыі з'яўляецца практычная накіраванасць. І для практыка-арыентаванага навучання шырока выкарыстоўваюцца магчымасці клінічных баз і самага сучаснага абсталявання ўстаноў аховы здароўя.

Рэктар ВДМУ доктар медыцынскіх навук прафесар Анатоль ШЧАСНЫ.

У замежным рэйтынгу

Міжнародная дзейнасць — адзін з ключавых кірункаў развіцця ВНУ.

Віцебскі ўніверсітэт зарэгістраваны ў такіх рэйтынгавых сістэмах як Webometrics Rankingof World Universities, QS World Ranking, SIR, LeidenRanking, Mosiur, RUR.

А сёлета стаў адзінай ВНУ Беларусі, якая ўвайшла ў агульны рэліз міжнароднага рэйтынга Times Higher Education University Impact Rankings 2019.

Летась універсітэт прыняў удзел у глабальным міжнародным даследаванні Адукацыйнай камісіі для выпускнікоў замежных ВНУ ECFMG (Філадэльфія, ЗША) і праграме даследаванняў Міжнароднага фонду паляпшэння медыцынскага абслугоўвання.

Будучы акрэдытаваным у якасці міжнароднага эксперта, ВДМУ ўдзельнічае ва ўдасканаленні міжнароднай праграмы ранжыравання ўніверсітэтаў Global World Communicator Educationand Science.

Па выніках міжнароднага конкурсу Оксфардскага саміту лідараў «Навука і адукацыя», які праводзіцца клубам рэктараў Еўропы, ВДМУ у 2013 годзе быў удастоены І месца ў намінацыі «Адукацыя і інавацыі: вернасць якасці».

Паспяховае развіццё праграм акадэмічнай мабільнасці студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта спрыяе павышэнню акадэмічнай рэпутацыі ВНУ, абмену сучаснымі адукацыйнымі тэхналогіямі і ўкараненню сусветнага вопыту ў падрыхтоўцы канкурэнтаздольных кадраў. Такім чынам, за апошнія пяць гадоў для ўдзелу ў розных праграмах мабільнасці за мяжу выязджала больш за 800 студэнтаў ВДМУ. Разам з тым, акадэмічная мабільнасць не зводзіцца да перамяшчэння ў замежную ВНУ з мэтай асваення навучальных дысцыплін, якія не маюць дачынення да спецыяльнасці навучэнцаў, а арыентавана перш за ўсё на атрыманне студэнтамі дадатковых кампетэнцый у рамках будучай прафесіі.

Супрацоўнікі ВДМУ з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу прымаюць удзел у міжнародных навуковых падзеях, павышаюць свой прафесійны ўзровень на стажыроўках ва ўстановах вышэйшай медыцынскай і фармацэўтычнай адукацыі і практычнай аховы здароўя. Так, з 2015 года больш за 500 выкладчыкаў універсітэта выязджалі за мяжу з гэтай мэтай.

Міжнародная дзейнасць ВДМУ накіравана на забеспячэнне інтэграцыі ў міжнародную ўніверсітэцкую супольнасць, атрыманне навучальнай установай дадатковых магчымасцяў паскоранага развіцця і канкурэнтных пераваг у параўнанні з іншымі ВНУ. У гэтым плане ўніверсітэт ужо мае трывалы базіс у выглядзе партнёрскіх адносін больш чым з 80 замежнымі ўніверсітэтамі.

Немалаважным кірункам міжнароднай дзейнасці ўніверсітэта з'яўляецца ўдзел у міжнародных праграмах і праектах. Штогод ВДМУ прымае ўдзел у конкурсах заявак такіх праграм, як Германская служба акадэмічных абменаў (DAAD), Erasmus+, Horizont 2020, MOST, Праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва «Літва—Латвія—Беларусь». Сёлета атрыманы грант на рэалізацыю сумесных праграм акадэмічнай мабільнасці студэнтаў і выкладчыкаў Erasmus+ сумесна з універсітэтам Кордавы (Іспанія).

Экзаменацыйныя цэнтры за мяжой

Яшчэ адной з ключавых задач з'яўляецца экспарт адукацыйных паслуг.

У 1981 годзе рашэннем Міністэрства адукацыі і Міністэрства аховы здароўя СССР ВДМУ (тады яшчэ ВДМІ) адной з першых беларускіх ВНУ атрымаў права падрыхтоўкі спецыялістаў для замежных краін. З 1989 года ў інстытуце адкрыта падрыхтоўчае аддзяленне для замежных грамадзян. А з 1997 года пачаў функцыянаваць факультэт падрыхтоўкі замежных грамадзян.

У 2002 годзе ўніверсітэт першы з установ вышэйшай медыцынскай адукацыі Беларусі пачаў падрыхтоўку замежных студэнтаў з выкарыстаннем англійскай мовы ў якасці мовы-пасрэдніка. Гэта дазволіла павысіць якасць адукацыйных паслуг для замежных грамадзян. І, як следства, падняць аўтарытэт і канкурэнтаздольнасць універсітэта ў міжнародным адукацыйным асяроддзі.

У цяперашні час тут навучаюцца прадстаўнікі 45 краін. Кожны пяты студэнт ВДМУ — іншаземец.

Штогод забяспечваецца стабільны прырост экспарту адукацыйных паслуг. З 2017 года ва ўніверсітэце працуюць дыстанцыйныя анлайн-курсы па падрыхтоўцы да ўступных іспытаў па хіміі і біялогіі на рускай і англійскай мовах для абітурыентаў з ліку замежных грамадзян. Акрамя таго, у 2015 годзе запушчана праграма адукацыйных экзаменацыйных цэнтраў за мяжой. Першы такі цэнтр быў адкрыты на тэрыторыі Шры-Ланкі, у 2017 годзе — у Кувейце, а ў 2018 годзе — у Ліване.

Сёлета распачата рэалізацыя сумеснага адукацыйнага праекта з універсітэцкім каледжам імя Лінкальна (Малайзія) па навучанні грамадзян Малайзіі і Інданезіі. Згодна з гэтай праграмай, першыя два гады навучання будуць праходзіць у Малайзіі, а наступныя чатыры гады і, пры жаданні, інтэрнатура — на базе ВДМУ.

Стварэнне такога кшталту міжнародных адукацыйных цэнтраў і сумесных праграм дазваляе зрабіць працэс падрыхтоўкі, паступлення і навучання ва ўніверсітэце максімальна даступным і камфортным для замежных грамадзян, тым самым павялічваючы прэстыж і канкурэнтаздольнасць ВДМУ на сусветным рынку адукацыйных паслуг.

І нават перасадка нырак

У Віцебскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце паспяховым сімбіёзам навукі з дзейнасцю практычнай аховы здароўя з'яўляецца стварэнне навукова-практычных цэнтраў. На клінічнай базе Віцебскай абласной клінічнай бальніцы

працуе абласны навукова-практычны цэнтр «Хірургія захворванняў печані і падстраўнікавай залозы». Кіраўнік цэнтра — **рэктар ВДМУ доктар медыцынскіх навук прафесар Анатоль ШЧАСНЫ.**

У цэнтры ўкаранёныя і паспяхова ажыццяўляюцца ўнікальныя аперацыі пры хранічным панкрэатыце і пухлінах падстраўнікавай залозы (лапараскапічная панкрэатадуадэнальная рэзекцыя, лапараскапічныя рэзекцыі падстраўнікавай залозы па Бегеры і Фрэі)... Шырока выкарыстоўваюцца эндаскапічныя метады дыягностыкі і лячэння захворванняў гепатабіліярнай сістэмы.

З 2015 года выконваюцца трансплантацыі нырак.

У аддзяленні працуе кабінет ультрагукавой дыягностыкі, абсталяваны ультрагукавым апаратам экспертнага класа ALOKA ALPHA 7 ProSound.

Актыўна функцыянуюць на базе абласной бальніцы і навукова-практычны цэнтр «Інфекцыя ў хірургіі», абласны афтальмалагічны навукова-практычны цэнтр.

А ў сценах Віцебскага абласнога клінічнага кардыялагічнага цэнтра дзейнічае навукова-практычны цэнтр «Гемастазіялогія ў кардыялогіі».

На базе абласнога клінічнага спецыялізаванага цэнтра працуюць «Флебалагічны цэнтр», а таксама цэнтр «Хірургія тазавага дна», «Колапракталагічны цэнтр», дзе выконваюцца ўнікальныя высокатэхналагічныя ўмяшанні. Досвед работы цэнтраў пацвердзіў іх эфектыўнасць і дазволіў выконваць вялікі аб'ём высокатэхналагічных метадаў дыягностыкі і лячэння на рэгіянальным узроўні.

Штогод прафесарска-выкладчыцкім складам клінічных кафедраў праводзіцца ў сярэднім каля 15 000 абходаў, кансультуецца ў гарадах і раёнах Віцебскай і Магілёўскай абласцей не менш за 90 000 пацыентаў, выконваецца больш за 7000 аперацыйных умяшанняў, у тым ліку складаных і высокатэхналагічных.

У вольны час

У Віцебскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце створаны ўсе ўмовы для забеспячэння інтэлектуальнага, духоўнага і прафесійнага росту студэнтаў, іх сацыяльнага станаўлення, развіцця творчасці, ініцыятывы, змястоўнага вольнага часу, умацавання здароўя і фарміравання здаровага спосабу жыцця з улікам іх інтарэсаў і патрэб.

Вельмі плённа дзейнічае студэнцкі клуб. Пад яго эгідай займаюцца 12 калектываў мастацкай самадзейнасці і аб'яднанняў па інтарэсах.

На працягу навучальнага года праводзіцца больш за 60 канцэртных і культурна-масавых мерапрыемстваў.

Творчыя калектывы і салісты студэнцкага клуба паспяхова прадстаўляюць ВНУ на Усерасійскім фестывалі мастацтваў студэнтаў-медыкаў і медыцынскіх работнікаў і рэспубліканскім фестывалі творчасці студэнцкай і навучэнскай моладзі «Арт-вакацыі».

Пры спартыўным клубе працуюць 21 секцыя па 17 відах спорту. Функцыянуюць 19 груп здароўя для студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта. У спартыўных секцыях і групах здароўя рэгулярна займаецца больш за 600 чалавек. Ёсць дзве спартыўныя залы, міні-стадыён, стралковы цір, лыжная база, чатыры трэнажорныя залы, фітнес. Пазалетась быў уведзены ў эксплуатацыю спартыўна-аздараўленчы комплекс «Fortius».

Штогод студэнты ўніверсітэта прымаюць удзел больш чым у 70 спартыўна-масавых мерапрыемствах.

Адным з актуальных кірункаў выхаваўчай работы ва ўніверсітэце з'яўляецца валанцёрскі рух. У ВДМУ ажыццяўляе сваю дзейнасць савет валанцёраў, створаны па ініцыятыве студэнтаў. Працуюць чатыры валанцёрскія атрады. У 2016 і 2018 гадах студэнты ўніверсітэта сталі пераможцамі рэспубліканскага конкурсу «Валанцёр года».

Універсітэту належыць восем інтэрнатаў. У 2017 і 2018 гадах былі пабудаваны і ўведзены ў эксплуатацыю два студэнцкія інтэрнаты на 1000 месцаў, якія абсталяваны і аснашчаны па сучасных стандартах. На базе інтэрнатаў функцыянуюць студэнцкія кафэ, сталовая, кафетэрый, у інтэрнаце № 1 працуе клуб інтэрнацыянальнай дружбы...

Віцебскі медыцынскі — універсітэт, дзе цікава вучыцца, і сюды былыя выпускнікі вяртаюцца праз дзясяткі гадоў, каб успомніць насычаныя студэнцкія будні.

Падрыхтаваў Аляксандр ПУКШАНСКІ. Фота Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.

УНП 300002704

Нефармат

Пра матуль

Страшна пра гэта пісаць, прыкра, балюча. Вы ўжо ведаеце, пэўна. Вынесены прысуд 26-гадовай жанчыне з Лунінца і яе на 20 гадоў старэйшаму сябру-сабутэльніку за забойства 8-месячнай дзяўчынкі, дачкі падсуднай. Дзіцяці адрэзалі галаву. Казалі, што ўрач хуткай, якая прыехала канстатаваць смерць, страціла прытомнасць... 48-гадовы мужчына прыгавораны да найвышэйшай меры, і гэта першы смяротны прысуд за апошняе дзесяцігоддзе на Брэстчыне.

Пра яго не буду гаварыць, суд быў закрыты, інфармацыі мала. Яго каханцы, маці загубленага немаўляці, далей 25 гадоў, бо для жанчыны гэта максімальны тэрмін у нашай краіне. За чвэрць стагоддзя вырастуць яе старэйшыя дзеці, можа, створаць сем'і і народзяць сваіх дзяцей. Іх родным хутчэй за ўсё не ўдасца адгарадзіць іх ад інфармацыі пра родную маці. Нават праз гады набяруць у сеціве запыт, і паслухмяны «гугл» выдасць жудасныя факты. Лепш бы гэтага не здаралася, лепш бы прыдумаць сваякам якую легенду, хлопчыкі ж яшчэ малыя — 4 і 6 гадоў, а чулым выхавацелям у садку падтрымаць. Але ж на Дзень маці зноў будуць развучваць песні і чытаць вершы пра найлепшую маму на свеце. І гэтым хлопчыкам, пэўна, захочацца павіншаваць сваю...

Вядома, усе хочуць мець самую лепшую маму, як у песні. Такіх у нас, на шчасце, многа. Нашы жанчыны падтрымліваюць дзяцей, дапамагаюць ім ледзь не да самай іх, дзяцей, пенсіі. Нядаўна ў адной з вёсак размаўляла з 80-гадовай жанчынай. Муж памёр, жыве адна, бо сям'я аднаго сына — у Маскве, другога — у Адэсе. Унучкі — прыгажуні, маюць па дзве адукацыі. Не ўсе яшчэ замужам, а дзяўчатам у раёне трыццаці, гэты факт крыху засмучае бабулю. Спрабую яе супакоіць, разважаю, што цяпер так модна, спачатку адукацыя, кар'ера, а потым — сям'я: «Не бядуйце, а рыхтуйце грошы, бабуля, на вяселлі». «Даўно нарыхтаваны, — кажа яна, — мы з дзедам пры яго жыцці сабралі, і гэта недатыкальны запас. Я сёлета вокны мяняла, не хапала троху, то ў людзей пазычыла, а тых не зачапіла». Нядаўна ад сваёй сястры пачула, што адкладвае грошы ўнукам на вяселле, а малодшая ўнучка яшчэ і з пялёнак не вылезла. І гэта нармальная, я б сказала, будзённая практыка для нашых матуль сямействаў.

Нават наўскідку магу згадаць пяць-шэсць прыкладаў іншага кшталту — мацярынскага подзвігу, самаахвярнай барацьбы маці за сваіх дзяцей. Гэта прыклады з жыцця маіх герояў, людзей, пра якіх даводзілася пісаць у розныя гады. У іх шэрагу — Аня Бахур з Івацэвіч, інвалід першай групы. Ім з мужам не аддавалі дзіця з радзільні, бо муж таксама інвалід першай групы, калясачнік. Паводле нарматываў, людзі з такой інваліднасцю не могуць выконваць бацькоўскіх абавязкаў. Ганна нарадзілася з анамаліямі канечнасцяў, дакладней — без кісцяў рук і амаль без ступні. Яе самую пакінулі ў радзільным доме. Яна выраслa ў інтэрнаце.Там навучылася шыць, маляваць, спраўляцца з любой жаночай работай. І за права быць маці яна змагалася як сапраўдны баец. Праз СМІ, можна сказаць, усю краіну на вушы паставіла. Тагачасны міністр сацыяльнай абароны Мар'яна Шчоткіна прыехала ў Івацэвічы і дапамагла маці пакінуць у сябе дзіця. Цяпер Ганна гадуе 4-гадовага сыночка, многія людзі ёй дапамагаюць. А яна ўдзячная ўсім, хто падтрымаў яе тады, калі ўсё вісела на валаску.

У Ганны ў бальніцы я была лагодным вераснем, а вось халодным лістападаўскім днём мы сядзелі ў Ружанах у доме Алены Клімовіч. Жанчына расказвала, што рана пахавала мужа. Малодшы сын з дзяцінства хварэў, мае затрымку ў развіцці. Але калі паўстала пытанне аб перасадцы ныркі, яна не задумваючыся аддала сваю. Яе многія адгаворвалі, не падтрымалі нават некаторыя сваякі. Ды Алена настояла на аперацыі. Цяпер і сама на прэпаратах, і Саша прымае таблеткі па раскладзе, але ж яны шчаслівыя з сынам.

А ў Целяханах жыве Галіна Арцюх, пра якую я пісала гадоў 15 таму. Яе сяброўка з мужам загінулі ў аварыі, пакінулі шасцёра дзяцей сіротамі. І Галіна з мужам крута памянялі сваё ўладкаванае жыццё, пераехалі з райцэнтра ў пасёлак. Бо раней жылі ў двухпакаёвай кватэры з трыма дзецьмі. На сям'ю, у якой стала дзевяць дзяцей, спатрэбілася большая жылплошча. За чаем на кухні яна расказвала, што паўплывала на імгненнае рашэнне. Яна выпадкова пачула, як дзеці дамаўляліся, што па чарзе будуць прапускаць школу, каб даглядаць малых, а ў дзіцячы дом не пойдуць. І гэта стала апошняй кропляй. Расказвала, як было неймаверна цяжка спачатку, а самы маленькі адразу стаў называць яе мамай. Калі пайшоў у садок, вельмі часта прыносіў свае малюнкі, дзе яна вясной у кветках, зімой у сняжынках, восенню пасярод жоўтых лістоў.

Вось і лунінецкія хлопчыкі, дзеці той, асуджанай, будуць маляваць, рабіць на ўроках працы падарункі да мамінага дня. І няхай аднясуць іх бабулі, а маму забудуць. Была мама, потым паехала ў круіз і звалілася з абрыву ў акіян, растварылася ў бездані.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Даты Падзеі Людзі

31 КАСТРЫЧНІКА

У краіне

1800 год — распрацаваны горадабудаўнічы рэгулярны план Мінска. Потым такія планы ствараліся ў 1809, 1817, 1858 гадах.

1905 год — па загадзе губернатара П. Курлова расстраляны 20-тысячны мітынг у Мінску. У дзень абвяшчэння ў горадзе царскага маніфеста, які дэкларавaў усталяванне ў дзяржаве дэмакратычных свабодаў, на плошчы Віленскага вакзала адбыўся шматтысячны мітынг, які быў расстраляны войскамі мінскага гарнізона са згоды губернатара П. Курлова. У выніку каля 100 чалавек былі забітыя, каля 300 чалавек — параненыя. Мінскі кааліцыйны камітэт у знак пратэсту абвясціў усеагульную стачку, якая працягвалася да 6 лістапада 1905 года. Абурэнне жорсткай расправай над удзельнікамі мітынгу было такое моцнае, што ўлады мусілі адклікаць Курлова ў Пецярбург і прызначыць афіцыйнае расследаванне. Аднак Курлоў не прызнаў сваёй віны і пераклаў яе на ваеннае камандаванне. У памяць аб ахвярах Курлоўскага расстрэлу на станцыі метро «Плошча Леніна» ў Мінску ўстаноўлены мемарыяльны знак.

1915 год — частка тэрыторыі Беларусі больш як на два гады была акупавана германскімі войскамі па лініі Дзвінск—Паставы—Баранавічы—Пінск.

1917 год — у Мінску праходзіў (да 6 лістапада) з'езд воінаў-беларусаў Заходняга фронту; удзельнічалі таксама прадстаўнікі Паўночнага і Румынскага франтоў, Балтыйскага флоту. З'езд выказаўся за аўтаномію Беларусі, за адкрыццё беларускага ўніверсітэта і іншых ВНУ, стварыў Часовы выканаўчы камітэт Цэнтральнай беларускай вайсковай рады.

1930 год — нарадзіўся Леў Мікалаевіч Гумілеўскі, скульптар, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, народны мастак Беларусі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны разам з бацькамі пасяліўся ў Нясвіжы. Жыў у замку. Стаў займацца ў мастацкай студыі. Паступіў і паспяхова скончыў Мінскае мастацкае вучылішча, пазней — Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут. Член Саюза мастакоў СССР. Працуе ў галіне манументальнай і станковай скульптуры, у апошнія гады — у суаўтарстве з сынам Сяргеем. Унёс вялікі ўклад у мастацкае афармленне нясвіжскага парка падчас яго рэстаўрацыі.



1934 год — нарадзіўся (вёска Хоўхлава Маладзечанскага раёна) Тадэвуш Антонавіч Кокштыс, акцёр, народны артыст Беларусі. З 1958 года ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Я. Коласа. Характарны камедыйны акцёр. Сярод роляў: Станіслаў Касінскі («Званы Віцебска» У. Караткевіча), Гастрыт («Вечар» А. Дударава), Блазан («Кароль Лір» У. Шэкспіра) і іншыя. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

У свеце

1922 год — нарадзіўся Анатоль Дзмітрыевіч Папанаў, савецкі і расійскі акцёр тэатра і кіно, акцёр Маскоўскага тэатра сатыры, народны артыст СССР. Здымаўся ў фільмах «Прыходзьце заўтра», «Жывыя і мёртвыя», «Брыльянтавая рука», «Беларускі вакзал» і многіх іншых. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Памёр у 1987 годзе.

1967 год — Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР зацверджаны ордэн Кастрычніцкай рэвалюцыі.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.07	17.39	9.32
Віцебск —	8.00	17.25	9.25
Магілёў —	7.57	17.29	9.32
Гомель —	7.50	17.30	9.40
Гродна —	8.21	17.54	9.33
Брэст —	8.18	17.59	9.41

Месяц

Маладзік

28 кастрычніка.

Месяц у сузор'і Стральца.

Імяніны

Пр. *Златы, Андрэя, Іосіфа, Сяргея, Юльяна.*

К. *Антаніны, Аўгуста, Лукі, Урбана.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Чаму рэцэпты на кулінарных сайтах нельга адсартаваць па колькасці посуду, які прыйдзецца перамыць пасля прыгатавання стравы?..

Фраза «Мілы, падай мне, калі ласка, каляровыя невідзімкі» зламала мужчынскую логіку.

Аб'ява ў газеце.

«Шукаю кватэру. Яна павінна быць настолькі вялікая, каб у маёй жонкі не з'явілася жаданне з'ехаць да сваёй маці, і, разам з тым, настолькі малая, каб у яе маці не з'явілася жаданне жыць разам з намі».

Неяк муж з жонкай вырашылі паўспамінаць мінулае. Яна, у роспачы:

— Ну, і дзе ж ты быў раней, радасць мая?

І тут муж так расплакаўся, успомніўшы, у якіх цудоўных месцах быў раней.



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ ТЭЛ./ФАКС: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 3533.

Нумар падпісаны ў 19.30 30 кастрычніка 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12